Праверыць баявую гатоўнасьць МТС да сяўбы

Алма-Ата, Ленина 81
Гос.Публ.Библ-ка
февр.янв.32 г. | СБ.-I | ЭТА

Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся! ... йтесь! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

XII ГОД ВЫДАНЬНЯ

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ЧАЦЬВЕР 26 САКАВІКА 1931 ГОДУ. № 69 (3157) №68

ОРГАН Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

МТС--важаты калектывізацыі
МТС--на пракатны пункт

Артыкул старшыні ЦКК КП(б)Б тав. КАЛНІНА

Баявая задача партыі

Зрабіць нізавы апарат перадавым фарпостам дыктатуры пралетарыяту на вёсцы

Партыя і савецкая ўлада вялі і вядуць сыстематычную работу за палепшаньне савецкага апарату. На ўсіх партыйных і савецкіх зьездах пытань... апарату ў тэй ці іншай пастаноўцы ня выходзіць з парадку дню.

«Пытаньне аб нашым дзяржапараце — гаварыў Ул. І. Ленін—старое і заўсёды новае пытаньне».

Чым тлумачыцца гэтая ўвага пытаньням палепшаньня савецкага апарату.

Тым, што бяз клясава-чоткага апарату, шчыльна зьвязанага з шырокімі масамі працоўных, які падхапляе і арганізуе іх працоўны энтузіязм, мы не змаглі-б дагэтуль і зараз ня зможам выканаць задач сацбудаўніцтва.

Ня ўсе нізавыя арганізацыі на сапраўднаму адносяцца да гэтага пытаньня.

Ня гледзячы на тое, што праз тыдзень-два пачнуцца буйнейшыя работы, лесаматар'ял вывезен усяго на 65 проц. Расонскія раённыя арганізацыі злачынна адносяцца да падрыхтоўкі да будаўніцтва МТС. Пад МТС адвялі вельмі нізкі вучастак зямлі, дзе трактары будуць тразнуць. Ніхто не пакланоціцца аб тым, каб даць патрэбнае памяшканьне пад кантору. Дырэктару МТС прыходзіцца жыць на хутары, у 5 клм. ад гораду.

Таксама надбайна адносяцца да будаўніцтва МТС і Стара-Дароскія раённыя арганізацыі. Недапушчальна дрэн на праходзіць рэалізацыя трактарных абавязацельстваў: на 20 сакавіка г. г. акцый трактарацэнтру на першы квартал рэалізавана па БССР у разьмеры 16 проц., а на раёнах МТС 16,7 проц. Зусім не праводзіцца рэалізацыя акцый у наступных раёнах: Бабруйскім, Багушэўскім, Віцебскім, Боркавіцкім, Ветрынскім (МТС), Дрыбінскім, Ельскім, Жлобінскім, Жыткавіцкім (МТС), Лядзінскім, Лагойскім, Мешскім, Нараўлянскім, Хойніцкім, Чырвона-Польскім, Сіроцінскім (МТС). Некаторыя раёны рэалізавалі акцый на нязначны процант; Уваравіцкі раён рэалізаваў на 2 проц., Чашніцкі—1,2 проц., Чэрыкаўскі—2,1 проц., Азарыцкі—1,4 проц., Багушэўскі—1,5 проц., Высачанскі 0,1 проц., Грэскі—0,6 проц., Коханаўскі—0,5 проц., (МТС) — 0,2 проц., Лёзьненскі (МТС)—1,1 проц., Пухавіцкі—0,2 проц. Добра справіліся з гэтай работай: Церахоўскі раён, які рэалізаваў акцый на 100,9 проц., Касьцюковіцкі—230 проц.

Заданьне па заключэньні дагавароў выканана на 80 проц. (Да 25-III г. г. павінна быць скончана поўнасьцю). Слаба справіліся з заданьнем з заключэньнем дагавароў: Стара-Дароская МТС, якая выканала 33 проц., Асьвейская—36 проц., Гарадокская—50,2 проц., Дубровенская—51 проц. Закончылі дагаворную кампанію з перавышэньнем—Клімавіцкая 102 проц., Жыткавіцкая—101 проц., Мсьціслаўская—102 проц., Танская—129 проц.

Рамонт трактараў па лініі МТС выкананы на 83 проц., па лініі калтэрацыйна-калгаснай сыстэмы толькі на 50 проц. Пагроза ніяк рамонту выканая на 68,5 проц. Калгасна-калтэрацыйны сэктар упарта адцягвае рамонт трактараў.

Маючыяся прарывы ў радзе МТС трэба неадкладна ліквідаваць.

МТС--АРГАНІЗАТАР САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРКІ

Прывесьці ў баявую гатоўнасьць МТС

Будаўніцтву МТС у БССР адводзіцца вельмі многа ўвагі і сродкаў. Зараз павінна пачацца будаўніцтва ў 24 МТС. З Белсельбудам заключана ўмова на правядзеньне будаўніцтва. На будаўніцтва МТС, набыцьцё трактараў, транспарту, абсталяваньне майстэрняў і інш. вызначана ў гэтым годзе 6.930.000 руб. У БССР мае быць набудавана 8 майстэрняў капітальнага рамонту, з пропускной здольнасьцю ў 400 трактараў у год. Майстэрні павінны быць скончаны не пазьней 1 верасьня г. г.

У 5 МТС (Койданайскай, Копыльскай, Ветрынскай, Танежыцкай і Клімавіцкай, павінна быць сёлета праведзена ўнутраная тэлефанізацыя. Гэтыя МТС павінны быць злучаны тэлефонамі з калгасамі, якія яны абслугоўваюць.

Як відаць з праграмы будаўніцтва, заданьне досыць значнае. Падрыхтоўцы да будаўніцтва МТС павінна быць зьвернута вялікая ўвага. Між тым, ня ўсе нізавыя арганізацыі па сапраўднаму адносяцца да гэтага пытаньня.

Ня гледзячы на тое, што праз тыдзень-два пачнуцца будаўнічыя работы, лесаматар'ял вывезен усяго на 65 проц. Расонскія раённыя арганізацыі злачынна адносяцца да падрыхтоўкі да будаўніцтва МТС. Пад МТС адвялі вельмі нізкі вучастак зямлі, дзе трактары будуць тразнуць. Ніхто не пакланоціцца аб тым, каб даць патрэбнае памяшканьне пад кантору. Дырэктару МТС прыходзіцца жыць на хутары, у 5 клм. ад гораду.

Таксама надбайна адносяцца да будаўніцтва МТС і Стара-Дароскія раённыя арганізацыі. Недапушчальна дрэн на праходзіць рэалізацыя трактарных абавязацельстваў: на 20 сакавіка г. г. акцый трактарацэнтру на першы квартал рэалізавана па БССР у разьмеры 16 проц., а на раёнах МТС 16,7 проц. Зусім не праводзіцца рэалізацыя акцый у наступных раёнах: Бабруйскім, Багушэўскім, Віцебскім, Боркавіцкім, Ветрынскім (МТС), Дрыбінскім, Ельскім, Жлобінскім, Жыткавіцкім (МТС), Лядзінскім, Лагойскім, Мешскім, Нараўлянскім, Хойніцкім, Чырвона-Польскім, Сіроцінскім (МТС). Некаторыя раёны рэалізавалі акцый на нязначны процант; Уваравіцкі раён рэалізаваў на 2 проц., Чашніцкі—1,2 проц., Чэрыкаўскі—2,1 проц., Азарыцкі—1,4 проц., Багушэўскі—1,5 проц., Высачанскі 0,1 проц., Грэскі—0,6 проц., Коханаўскі—0,5 проц., (МТС) — 0,2 проц., Лёзьненскі (МТС)—1,1 проц., Пухавіцкі—0,2 проц. Добра справіліся



Першы выезд толькі што атрыманай калгасам «Ленінскі Шлях» трактарнай калёны. (Магілеўскі р.).

Узброімся тэхнікай

(Гутарка з дырэктарам Гарадоцкай МТС т. Нікіфаравым—дэлегатам III Усебеларускага Зьезду Калгасаў).

Гарадоцкая МТС заснавана толькі сёлета. Аднак, ужо ад першых дзён існаваньня яна зрабіла вялікі ўплыў на ход калектывізацыі раёну, якая адразу ўзрасла на 3 проц. пры жорсткай клясавай барацьбе.

МТС складаецца з 55 трактароў, з якіх ужо зараз маецца на месцы 43 трактары і адпаведная колькасьць прычэпнага інвэнтару, да іх: сеялак, малатарнаў, плугоў і г. д. Да канца пяцігодкі гэтая МТС узрасьце да 250 трактароў.

Галоўны лёзунг з якім МТС прыступіла да работы,—кожны калгасьнік павінен умець працаваць на трактары і складаных сельска-гаспадарчых машынах.

Для ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу ў часе перапынкаў паміж палявымі работамі будуць праводзіцца нарады і практычнае азнаямленьне з с.-г. машынамі ня толькі калгасьнікаў, але і аднаасобнікаў. Ад ступені аўладаньня тэхнікай у значнай меры залежыць прадукцыйнасьць працы і павялічэньне ўраджайнасьці. Гэтыя нарады і павіны зьявіцца стымулам да поўнага аўладаньня тэхнікай.

Зараз у Гарадоцкім раёне ёсьць тэхнікум мэханізацыі сельскай гаспадаркі, рэарганізаваны з былой прафшколы. 40 чалавек, бадай выключна калгасьнікаў адабрана на вучобу ў тэхнікум. Ужо ўвосень тэхнікум выпусьціць першую партыю спэцыялістаў мэханікаў. Камплектаваньне тэхнікуму будзе праводзіцца ў далейшым выключна за лік ударнікаў - калгасьнікаў. Пасьля скончэньня тэхнікуму лепшыя слухачы будуць пасылацца на далейшую вучобу, аж да інстытутаў, якія даюць нам інжынэраў сельскай гаспадаркі.

Пры МТС намечана пабудаваньне майстэрні капітальнага рамонту трактароў і розных с.-г. машын. У гэтай майстэрні будуць практычна падрыхтоўвацца сьлесары, мэханікі, такары і інш.

Вось пэрспэктывы работы Гарадоцкай МТС у галіне аўладаньня калгасьнікамі тэхнікай, у галіне падрыхтоўкі спэцыялістаў сельскай гаспадаркі.

Учора закрыўся III Усебеларускі зьезд калгасаў

Адрапартавала мандатная камісія аб хутчэйшым аб'яднаньні іх у калгасы.

— 444 дэлегаты ўдзельнічалі ў зьезьдзе, з іх 36 — аднаасобнікаў. Жанчын—95.

Членаў і кандыдатаў партыі—293. камсамолу—16. Рабочых—58, рабочых 25-тысячнікаў—51, служачых—76, батракоў—26, беднякоў — 157, сярэднякоў—9.

Беларусаў—342, яўрэяў—47, палякаў—13.

— Вось твар зьезду.

◆ Шматлікія заявы аб уступленьні ў калгасы, у партыю, аб абвяшчэньні сябе ўдарнікамі—нясупынна зачытваюцца прэзыдыўмам.

Так, дэлегацыя Чырвона-Слабодзкага раёну выклікала дэлегацыі Слуцкага і Старобінскага раёнаў.

Любаньская дэлегацыя—Глускую, Старобінскую і Бабруйскую;

Хойніцкая—Брагінскую, Рэчыцкую;

Бешанковіцкая—Сіроцінскую і Чашніцкую;

Капыльская — Шклоўскую, Аршанскую;

Лёзьненская—Ветрынскую;

Ветрынская — Гомельскую, Чачэрскую;

Коханаўская—Расьнянскую, Горацкую, Дрыбінскую.

◆ Тав. Галадзед прывітаў зьезд ад імя СНК БССР, спыніўшыся падрабязна на мэтах зьезду.

◆ Ухвалена адозва да беднякоў і сярэднякоў-аднаасобнікаў з заклікам аб хутчэйшым аб'яднаньні іх у калгасы.

◆ Прыняты рэзалюцыі.

Ухвален заклік да ўсіх рабселькораў, каб яны сталі на дапамогу за сацыялістычную перабудову вёскі.

Пасланы ліст да рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

Накіравана прывітаньне Калгасцэнтру СССР.

Прагаласаваны кандыдатуры членаў праўленьня Белкалгасцэнтру.

— Т. т. Міцькоў, Стрэле, Камаеў, Шкурдзе (рабочы вылучэнец), Залескі (стары калгасьнік), Бягун, Кавалёў, Балцін, Гутман, Красоўскі, Грыневіч (старшыня Слуцкага райкалгасаюзу) і Жарын новае праўленьне Белкалгасцэнтру.

Кандыдатамі да іх абраны т. т. Лабанаў, Курган, Кірсон, Асмалоўскі, Калмык і Казімірскі.

◆ Работа зьезду—гэта барацьба за ўзмацненьне тэмпаў калектывізацыі.

◆ Закрываючы зьезд мы можам заявіць партыі, што 160 тысяч калгасных сем'яў зробяць усё залежнае ад іх, каб чацьвёрты Ўсебеларускі зьезд калгасаў быў зьездам суцэльнай калектывізацыі,—заканчвае сваю прамову тав. Міцькоў.

◆ За суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе базе кулацтва, як клясы!

◆ Сьпевам «Інтэрнацыяналу» закрываецца зьезд.

Арганізавалі суботнік на карысьць трактарнай калёны

(М. Жаберыцкі с-с, Крупскага р.)

Сіламі партыйных і камсамольскіх арганізацый сельсавету, у Мала-Жаберыцкім сельсавеце 5-6 сакавіка быў праведзены суботнік на карысьць трактарнай калёны раёну.

Бядняцка - сярэдняцкая сялянства ўсіх вёсак сельсавету прыняла актыўны ўдзел у суботніку і аднадушна на сваіх сходах выносіла пастанову—заработак за гэты дзень перадаць у фонд пабудовы трактарнай калёны раёну.

Усе сельсаветы Крупскага раёну павінны ўзяць прыклад з Мала-Жаберыцкага сельсавету. **Селькор.**

Трактарная калёна без дапамогі

У Даманавічах, Мазырскага раёну ёсьць трактарная калёна з 5 трактараў, якія патрабуюць рамонту. Калі калёнаважаты зьвярнуўся ў Мазырскі Райкалгассаюз за дапамогай, дык там адказалі: каму працавалі ад таго запрымлівайце і тропы. Калгасы таксама катэгарычна заявілі, што трошай на рамонт няма. Нарэшце калёнаважаты неяк пазычыў 50 руб. і адаслаў рамантаваць трактары. У сучасны момант машыны ўжо 10 дзён як ад рамантаваны, але няма за што выкупіць і даставіць на месца. Патрэбны таксама запасныя часткі, але іх няма. Мазырскі Райкалгассаюз зусім ня цікавіцца становішчам трактарнай калёны. Трактарысты ўжо чатыры месяцы не атрымлівалі пенсіі. Трэба каму належыць наладзіць парадак у Райкалгассаюзе.

В—р.

Зрываюць будаўніцтва МТС

(Клімавіцкі раён).

Клімавіцкі леспрамгас тармозіць работу па пабудове Клімавіцкага МТС. Работнікі леспрамгасу ня прымаюць належных мер да забесьпячэньня будаўніцтва МТС лесаматар'ялам, а абмяжоўваюцца пасылкай паперак вучлесу. Ніхто з леспрамгасу не правярае як выконваюцца на мясцох, даставка лесу на месца будоўлі МТС. Між тым вывазка матар'ялаў арыгінальна. Віноваты і Белсельбуд, які не пакланяўся раней аб забесьпячэньні будаўніцтва МТС лесаматар'ялам.

Музыка С.

Лельчыцкія апартуністы зрываюць падрыхтоўку кадраў

У Лельчыцкім раёне адкрыліся паўтарамесячныя курсы для падрыхтоўкі для калгасаў тэхнікаў розных спэцыяльнасьцяй: жывёлаводаў, сьвінаводаў і інш. Лельчыцкі раён павінен стаць раёнам мяса і малака і ў зьвязку з гэтым павінна быць зьвернута вялікая ўвага на арганізацыю курсаў па жывёлагадоўлі. Але лельчыцкія арганізацыі глядзяць на гэта інакш.

Заняткі павінны былі пачацца 20 студзеня, а з-за нядбайнасьці загадчыка пачаліся 31 студзеня. Укамплектаваньне курсаў праводзілася дрэнна. Калгас «Прагрэс» Сіманіцкага сельсавету назначыў на курсы нямісьменных людзей, у той час, калі там меліся добра пісьменныя камсамольцы. Старшыня калгасу, Хвацік Пятро, з ухмылкай сказаў: «нічога, там навучацца...» Заняткі пачаліся без належнага падбору лектароў. Райком КП(б)Б зусім адмовіўся вызначыць лектара па пытаньні палітыкі партыі на вёсцы. Агранном Зазюльчык прачытаў 2 лекцыі, а потым адмовіўся ад выкладаньня. Заняткі праводзяцца па 3-4 разы ў тыдзень, з прычыны адсутнасьці лектароў і самога загадчыка. Загадчык Ляўчэня кідае курсы на 3-4 дні. Курсанты днямі ходзяць, нічога ня робяць.

Я. А. Шульман.

Сененская МТС рыхтуецца да вясны

(ГУТАРКА СА СТАРШЫНЁЙ СЕНЕНСКАГА РАЙКАЛГАССАЮЗА ТАВ. ГАРАЎЦОМ).

Наша Сененская МТС мае 46 трактараў, яны ўжо адрамантаваны і могуць выйсьці хоць сёньня на поле. Пры МТС на курсах вучацца 180 рулявых і іншых спэцыялістаў. Ужо адрамантавана 300 плугоў, 3 сеялкі, больш за 100 боран і інш. сельскагаспадарчага інвэнтара.

МТС заключыла 48 дагавароў з калгасамі і часткова з бядняцка-сярэднякамі гаспадаркамі па апрацоўцы зямлі ў часе вясеньняй сяўбы.

Такая колькасьць заключаных дагавароў нас задаволіць ні ў якім разе ня можа. Марудныя тэмпы заключэньня дагавароў з калгасамі тлумачыцца тым, што яшчэ ня ўсе калгасы злажылі вытворчыя планы. Такое становішча адбіваецца на складаньні вытворча-фінансавага пляну МТС,—яго яшчэ дагэтуль няма.

Будаўніцтва МТС праходзіць нездавальняюча. Патрэбна загатовіць і вывезьці 3.100 куб. мэтраў драўніны, а тэтым напрамку яшчэ нічога ня зроблена.

Ня гледзячы на тое, што ўсе фармальнасьці выкананы, Леспрамгас зацягвае забесьпячэньне будаўніцтва лесаматар'ялам.

У часе заключэньня дагавароў МТС з калгасамі і бядняцка-сярэднякамі сялянствам наглядалася новая хваля прыліву бядняцка-сярэднякіх гаспадарак у калгасы. Так, у калгас «Латыгаль» уступіла 4 бядняцка-сярэднякіх гаспадаркі; у калгас «Асінаўка» уступіла 26 бядняцка-сярэднякіх гаспадарак; наглядаецца прыліў і ў іншыя калгасы.

Усебеларуская нарада інспэктароў народнае асьветы

Учора а 5 гадзіне ўвечары адкрылася Ўсебеларуская нарада інспэктароў народнае асьветы. На абвесцы дню нарады стаяць наступныя пытаньні: 1) даклад аб пасеўнай кампаніі і задачах органаў нарасьветы; 2) аб ходзе работы па ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі непісьменнасьці; 3) аб адзіным культыпляце і задачах органаў народнае асьветы; 4) аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы педагагічных, палітасьветных і мастацкіх кадраў; 5) аб становішчы палітасьветнай работы.

Падрабязны матар'ял аб нарадзе будзе зьмешчаны ў бліжэйшым нумары газэты «Савецкая Беларусь».



ДАРЭМНЫЯ ПАТУГІ.

Да ўсіх калгасаў, да ўсіх калгасьнікаў Савецкай Беларусі і САВЕЦКАГА САЮЗУ

Таварышы!

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі калгасы БССР правялі першую веснавую сяўбу.

Гэтай перамогі мы дабіліся ў нерымірымай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі—ворагамі калгаснага руху і памочнікамі кулака.

Гэтай перамогі мы дабіліся, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і арганізуючы шалёнае супраціўленьне кулацтва.

Выкананьне пляну першай калгаснай вясны мы нанесьлі бязьлітасны ўдар па кулацкай праграме правых апартуністаў і контр-рэвалюцыйных дзейнасьці сацыял-інтэрвэнтаў.

Калгасы на справе даказалі аднаасобным бядняцка-сярэднякім масам сваю вялізарную перавагу калектыўнай гаспадаркі над гаспадаркай індывідуальнай.

Узброеныя баявым вопытам першай калектыўнай сяўбы, калгасы БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б дасягнулі новых гістарычных перамог у справе суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы.

Перавышана першапачатковая пяцігодка калгаснага будаўніцтва. Да канца пяцігадовага пляну суцэльная калектывізацыя СССР будзе ў асноўным закончана. Гэта ўжо беспаваротна вырашанае пытаньне. Дзесяткі тысяч новых аднаасобных бядняцка-сярэднякіх гаспадарак аб'ядналіся ў калектывы. Мацнеюць калгасы, нарожаныя ў агні суровай клясавай барацьбы. Вырасьлі тысячы новых с.-г. гігантаў. Зруйнавана стаўка беларускай контр-рэвалюцыі — нацыянал-дэмакратаў, на кулацкі сталыпінскі ўтар.

Калгаснае сялянства стала цьвёрдай і асноўнай апорай савецкай улады на вёсцы.

«Німа больш звароту да старога, кулацтва асуджана і будзе ліквідавана, застаецца адзін шлях — шлях калгасаў» (І. Сталін).

У адказ на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР агентурай міжнароднага капіталу — «прампартыяй», «ТКП», контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй меншавікоў-шкоднікаў і беларускімі нацыянал-дэмакратамі — расьце і мацнее магутны сталінскі прызыў калгасы.

Таварышы калгасьнікі! Мы стаім на парозе другой бальшавіцкай вясны. Веснавая сяўба надыходзіць. Гэта ўсладае на ўсіх нас вялізарныя задачы. Гэта абавязвае кожнага з нас сапраўды па-бальшавіцку сустрэць другую бальшавіцкую вясну.

Веснавая пасеўная кампанія трэцяга рашаючага году пяцігодкі мае найвялікшае значэньне для нашай далейшай пераможнай барацьбы за справу сацыялізму.

Барацьба за праграму веснавой сяўбы — гэта барацьба за завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у бягучым годзе, гэта барацьба за новы магутны ўздым калгаснага руху і ліквідацыю кулацтва як клясы.

Таварышы калгасьнікі, мы павінны сустрэць пасеўную кампанію ў поўнай баявой гатоўнасьці. Кожны калгас, кожны калгасьнік павінен змагацца за тое, каб плян другой бальшавіцкай вясны быў ня толькі выканан, але і перавыканан.

Ні адзін гектар не павінен застацца незасеяным. Трэці ўсебеларускі калгасны зьезд заклікае вас з падвойнай энэргіяй змагацца за кожны лішні гектар яравых пасеваў, за колькаснае і якаснае перавыкананьне праграмы веснавой сяўбы.

У мінулую асеньнюю сяўбу многія калгасы ня выканалі поўнасьцю пасеўных плянаў. У цэлым радзе калгасаў, азімы клін ня быў цалкам засеян.

Таварышы, хіба-ж можа дапусьціць, каб гэты ганебны прарыў быў не ліквідаваны. Трэба аддаць краіне гэты пасеўны доўг за кошт перавыкананьня праграмы другой веснавой калгаснай сяўбы.

Калгасы «Новае жыцьцё», «Полымя» і «Чырвоны факел» у рапартах «Зьвязьдзе» першымі ў БССР абавязаліся ліквідаваць азімы недасеў і павялічыць плошчу яравых пасеваў. Яны далі слова перавысіць заданьні па засеве яравога кліну, пакрыць недасеў азімны, скарыстаць запушчаныя землі, выкарыстаць кожны гектар незанятага папару і палепшыць сенажаць. Яны высунулі свае сустрэчныя пасеўныя пляны па выкананьні гэтых баявых задач.

Таварышы калгасьнікі, усе як адзін падхопім дасканалую ініцыятыву калгасаў «Новае жыцьцё» «Полымя» і «Чырвоны факел»! III усебеларускі зьезд калгасаў абавязвае калгасы БССР і заклікае ўсе калгасы СССР пасьледаваць гэтаму бальшавіцкаму прыкладу і ўключыцца ў штурм другой калгаснай вясны.

Кінем усе свае сілы на барацьбу за пашырэньне плошчы яравых пасеваў. Будзем біцца за кожны лішні гектар, арганізуем у кожным калгасе сустрэчныя пляны веснавой сяўбы.

Прыклад «Полымя», «Чырвонага факелу» і «Новага жыцьця»—у кожны калгас. Недапусьцім, каб хоць адзін гектар зямлі пуставаў. Праз сустрэчныя пляны, праз сацыялістычнае спаборніцтва, праз баявую падрыхтоўку да сяўбы даб'ёмся максымальнага павялічэньня плошчы яравых пасеваў.

Ні аднаго гектара незасеянага, ні аднаго гектара незанятага папару.

Таварышы калгасьнікі, пакрыйце недасеў азіміны, змагайцеся за поўнае выкарыстаньне запушчаных зямель, за палепшэньне санажацяй, каб забясьпечыць перамогу і ў другой бальшавіцкую вясну, каб стварыць магутную кармавую базу!

Таварышы калгасьнікі, арганізуйце сустрэчны плян веснавой сяўбы, пашырайце ініцыятыву калгасаў «Чырвоны факел», «Полымя» і «Новае жыцьцё»!

Вышэй тэмпы сацыялістычнага спаборніцтва, шырэй размах ударнага руху калгасаў!

Створым брыгады ударнікаў-калгасьнікаў па правядзеньні веснавой сяўбы, арганізуем брыгады якасьці ў калгасах, возьмем на грамадзкі буксір адстаючых.

Барацьбой за пашырэньне яравых пасеваў, бальшавіцкай рэалізацыяй адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі, правільнай арганізацыі працы, сапраўдным укараненьнем зьдзельшчыны, колькасным і якасным перавыкананьнем праграмы веснавой сяўбы арганізуем новы магутны ўздым калгаснага будаўніцтва, упягнем новыя дзесяткі тысяч аднаасобных бядняцка-сярэднякіх гаспадарак у калектывы.

Калгасны зьезд вітае пастановы 6 Усесаюзнага зьезду саветаў па пытаньнях далейшага будаўніцтва і працы калгасаў і абвяшчае сябе мабілізаваным на іх правядзеньне.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б неперад за перавыкананьне гэтых баявых задач, наперад да новых баёў і перамог за справу суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю кулацтва як клясы.

Мацней бязьлітасны ўдар па правых і «левых» апартуністах, якія на выгаду кулаку і шкоднікам прабуюць затрымаць пераможны калгасны рух!

Вышэй сьцяг сталінскага калгаснага прызыву У бальшавіцкі штурм за праграму другой калгаснай сяўбы!

III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ

Аб ходзе лёнаазагатовак

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 21 сакавіка 1931 г.

1. У яўна нездавальняючым ходзе ільназагатовак (на 20-III—37,7 проц. выкананьня гадавога пляну) асноўную ролю працягваюць граць тыя-ж прычыны, што былі адзначаны ў пастанове ЦК ад 30-XII—няправільная палітыка шэрагу раённых арганізацый у адносіне да кулацка-заможнай верхушкі вёскі (недастатковае абкладаньне кулацка-заможных гаспадарак і далёка недастатковае спагнаньне па цьвёрдым заданьням) недаацэнка значэньня ільназагатовак шэрагам партыйных арганізацый, а таксама формальна-бюрократычныя адносіны шэрагу цэнтральных і мясцовых сав. і гаспадарчых організацый да кіраўніцтва ходам ільназагатовак (фармальнае кіраўніцтва, адсутнасьць фактычнай праверкі выкананьня і г. д.).

2. Патрэбуецца ўсе загатоўчыя і раённыя арганізацыі аб тым, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы ні ў якім разе не павінна служыць прыстаноўкай выкананьня пляну ільназагатовак вак, якія павінны быць выкананы поўнасьцю.

3. Лічыць зусім недапушчальным усялякія разважаньні аб праўвялічэньні пляну ільназагатовак, немагчымасьці яго выкананьня, і вінаватых прыцягваць да адказнасьці.

4. Прыняць прапанову камісіі (чацьвёркі) па ільназагатоўкам, аб зьняцьці з работы сакратара РК КП(б)Б і старшыню РВК Сьвіслацкага раёну за зрыў ільназагатовак і праяўленьне правага апартунізму на практыцы, выразіўшаяся ў непрыняцьці рашучых заходаў па спагнаньню цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак і адсутнічаньне кіраўніцтва па ільназагатоўкам.

5. Прыняць прапанову камісіі—чацьвёркі аб працы камсамолу па ўзмацненьню ільназагатовак — адзначыць, што з боку ЦК ЛКСМБ ня было дастатковага кіраваньня раённымі арганізацыямі ЛКСМБ па ўдзелу іх у ільназагатоўках у прыватнасьці, зусім слаба праводзілася работа па праверцы выкананьня дырэктыў вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, а таксама і самога ЦК ЛКСМБ, у гэтай галіне.

Раўным чынам ЦК ЛКСМБ не праводзіўся вучот і выкананьне выніку па правядзеньні працы арганізацыямі КСМБ на мясцох.

6. Сэкцтару кадраў пераглядзець кіруючы склад раённых арганізацый ад стаючых раёнаў на прадмэт выяўленьня таварышоў, якія не спраўляюцца з даверанай ім работай (сельсаветы, сельскія саветы па сваёй работай для перасоўкі іх на камітэты і ячэйкі).

7. Прасіць НК РСІ і ЦКК правяраць за па выкананьню дырэктыў партыі і тавіцелей Бежгаасаюза і Белсельбуду работу Калгасцэнтру, а таксама загаўраду па апрацоўцы трэсты і саломы і здачы валакна, выявіць вінаватых і прыцягнуць да адказнасьці.

8. Зацьвердзіць пастанову камісіі чацьвёркі па ільназагатоўках ад 19 сакавіка 1931 г.

Сакратар ЦК КП(б)Б Гэй.

Пастанова чацьвёркі ЦК КП(б) і СНК БССР па ільназагатоўках

Пра ход ільназагатовак у Ветрынскім, Глускім, Касьцюковіцкім і Талочынскім раёнах.

1. Адзначыць, што Ветрынскі і Глускі раённыя выканаўчыя камітэты не дабіліся сапраўднага пералому ў ільназагатоўках і ня выканалі пастановы чацьвёркі ад 14 лютага 1931 г.

Аднак, адзначаючы, што за апошнюю пяцідзённку ў гэтых раёнах маецца некаторы зрух, прадставіць паказаным раёнам апошні тэрмін для ліквідацыі прарываў па ільназагатоўках да 5 красавіка г. г.

У выпадку неліквідацыі прарываў прывесьці ў выкананьне пастанову чацьвёркі ад 14 лютага аб прыцягненьні старшынь раённых выканаўчых камітэтаў гэтых раёнаў да адказнасьці.

2. За непрыняцьце захадаў, забясьпечваючых выкананьне ільназагатовак пляну і адсутнічаньне належнага вучоту па дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам, за невыкананьне гэтых заданьняў і за несвоечасовае рэагаваньне на дапушчэньне скрыўленьняў лініі партыі і ўраду ў адносінах да кулацка-заможных гаспадарак з боку шэрагу сельсаветаў—абвясьціць вымову старшыням Касьцюковіцкага і Талочынскага раённых выканаўчых камітэтаў.

3. Даручыць Пракурору Рэспублікі праверыць факт дачы Беларускай Кагторай трэсту «Сыраінвод» распараджэньня сваім саўгасам аб нездачы льна і іншых дзяржаве і скарыстаньні іх для мясцовых патрэб.

У выпадку нацьверджаньня вышэйпаказанага прыцягнуць вінаўных да адказнасьці.

Аб выніках паведаміць на наступным пасяджэньні чацьвёркі.

Старшыня чацьвёркі ЦК КП(б) СНК БССР Галадзед.

24-III-1931 г.

Раён—асноўнае зьсяно сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі

За дакладны, клясава-вытрыманы, нізавы савецкі апарат

„Вялізарныя задачы, што стаяць перад нашай краінай ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуюць перабудовы ўсёй работы саветаў і савецкага апарату, павароту іх тварам да вытворчасьці калгаснага будаўніцтва, рашучага перамаганьня апартунізму і адставаньня ад бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсёй савецкай рабоце зьверху да нізу...“ (з пастановы VI Усесаюзнага зьезду саветаў)

Койданаўскі раён--вызначан вопытна-паказальным раёнам

Перабудуем працу нізавога апарату

Раён у сыстэме савецкага кіраўніцтва адыгрывае вялізарнейшае значэньне, як вузлавы пункт сацыялістычнага будаўніцтва.

Ліквідацыя акруг і пераход на раённую сыстэму не абазначае проста звычайнага скарачэньня апарату. Гэтая рэформа зьяўляецца фактам выключнага палітычнага значэньня.

З ліквідацыяй акруг у корані мяняецца роля нізавых органаў партыі і ўлады, а ўся сыстэма савецкага кіраўніцтва яшчэ больш наближаецца, да насельніцтва, бо ліквідуючы акругі, перадаючы іх права раёнам, узмацняючы працу нізавых органаў, партыі і ўрад тым самым перадае на месцы вырашэньне цэлага раду важнейшых момантаў сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама і вырашэньне шматлікіх запытаньняў і патрэб працоўных, якім ня трэба для гэтага зварочвацца ў далёкі акруговы цэнтр.

Калі ў БССР да рэформы было 8 акруг, цэнтры якіх зьяўляліся цэнтрамі сацыялістычнай культуры і пралетарскага ўплыву на вёскі акругі, дык зараз у гэтыя цэнтры ператвараецца 100 з лішнім раёнаў. Гэтая сотня новых цэнтраў ужо зараз вядзе, а надалей будзе з яшчэ большым посьпехам весьці разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва; яны будуць расьці, узмацняцца і мацнець як дзейсныя органы дыктатуры пралетарыяту. Разам з гэтым парадчана правоў і самастойнасьці і ўмацаваньня ролі нізавых органаў—раённых, гарадзкіх і сельскіх—дае яшчэ большую магчымасьць уцягнуць шырокія колы рабочых, калгасьнікаў, бедняко ў і серадняко ў сялян у непасрэдны ўдзел ў кіраўніцтве дзяржавай, дае магчымасьць яшчэ больш разгарнуць масавую працу.

Рэформа праведзена вялізарнейшая і ўжо зараз у выніку яе мы адчуваем вялікія посьпехі, але хіба можна сказаць, што ўсё ў цэнтры і ў саміх раёнах зроблена, каб нізавы апарат поймаецьцо і цалкам быў прыстасаваны да новых правоў і абавязкаў.

Зразумела, што ў гэтай справе яшчэ маецца рад істотных недахопаў, якія перашкаджаюць нізавым органам цалкам аўладаць сваімі правамі і з поўным посьпехам ажыцьцяўляць значна павялічышуюся ролю ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Работа нізавых органаў і іх узаемаадносны паміж сабой і з вышэйстаячымі інстанцыямі ўсё яшчэ патрабуюць усямернай і напружанай увагі і канкрэтнай дапамогі па іх правільным вырашэньні.

Вось чаму набывае вялікае палітычнае значэньне тая работа, да якой зараз прыступае НК-РСІ ў гэтым напрамку: дэталёва вывучыць працу савецкага апарату і ўмовы яе ў адным з раёнаў БССР і на падставе гэтага правесьці вопытна-паказальную пастаноўку работы РВК і 3-х сельсаветаў з тым, каб вопыт ў гэтым раёне распаўсюдзіць на ўсю БССР.

Не павінна застацца ніводнага вучастку работы апарату, якую мы не закранулі-б. З галоўных момантаў зьяўляюцца наступныя: поўная перадачы РВК і сельсаветам правоў і самастойнасьці, выцякаючых з ліквідацыі акруг; узаемаадносіны раённых органаў з сельскімі, цэнтральнымі і паміж сабой; формы і мэтады кіраўніцтва і інструктажу як з боку раённаў сельсаветамі, так і цэнтру раёнамі; сыстэма, арганізацыя і тэхніка плянаваньня і вучоту народнай гаспадаркі і сацыяльна-культурнага будаўніцтва раёнаў; гібкая і добразмясная апэрацыйная праца РВК і с.-с. па ўсіх без выключэньня галінах дзейнасьці; найлепшае абслугоўваньне запытаньняў і патрэб шырокіх мас насельніцтва; рацыянальная тэхніка работы РВК і сельсаветаў.

У ліку задач, якія павінны вырашыць паказальная пастаноўка, выключна важнае значэньне мае пастаноўка лепшай масавай працы: сэкцыі, камісіі, нарады, брыгады, сходы па ўсіх напрамках і ўцягненьне мас рабочых: калгасьнікаў, батраноў, беднякоў і серадняко ў сялян ў практычную працу апарату ў кантроль над дзейнасьцю апарату, у дапамогу апарату ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і ўраду па пабудове сацыялізму. Зусім бясспрэчна, што ставячы перад сабой такія важныя ўсесаюзныя задачы мы павінны заняцца вывучэньнем сацыялістычных форм працы ў апараце раённых і сельскіх установаў (сац. спаборніцтва і ўдарніцтва, скразныя брыгады, буксір і інш) з тым, каб усямерна іх пашырыць і ўзкарэньць.

Зразумела каб, знайсьці правільныя шляхі вырашэньня паказаных пытаньняў, неабходна мець вычарпальныя даныя аб тым, што зараз перашкаджае правільнай і лепшай рабоце, г. зн. неабходна мець канкрэтныя факты і прыклады перашкод, а з другога боку—неабходна мець і прыклады добрай пастаноўкі, каб іх перанесьці на ўсе зьвяньні апарату.

Шырокія масы рабочых і калгасьнікаў, беднякоў і серадняко ў, працаўнікі апарату, спэцыялісты гораду і вёскі маюць агромную колькасьць фактаў, прыкладаў, узораў, як адмоўнай, так і станоўчай працы; яны маюць вывучарпальны запас ініцыятывы і вопыту, маюць поўную магчымасьць забясьпечыць РСІ добрыя вынікі намечанай работы шляхам актыўнай дапамогі і павінны гэта зрабіць, бо, палепшаньне працы нізавога апарату зьяўляецца адной з галоўнейшых задач у галіне кіраўніцтва і тым чарговым зьвяном, за якое неабходна ўхапіцца зараз ва ўсім аб'ёме і са ўсёй рашучасьцю.

Ніводны застывіст, рабочы, калгасьнік, бядняк, серадняк, спэцыяліст, служачы не павінен застацца ў баку ад палепшаньня працы раённых і сельскіх органаў. Кожны актывіст абавязан дапамагчы РСІ знайсьці тыя мерапрыемствы, якія ўзьнімуць працу нізавых органаў на вышэйшую ступень ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Матар'ялы, заметкі, меркаваньні, прапановы—павінны ісьці ў друк і ў органы РСІ ад тысяч актывістых працоўных і ад органаў савецкай грамадзкасьці.

Пры дапамозе мас РСІ выканае дырэктывы 16 зьезду УсеКП(б) аб рашучым зьмяненьні зьместу і мэтадаў работы сельсаветаў «у бок ўсё большага ахопу пытаньняў гаспадарчай і культурнай перабудовы вёскі» і аб тым, што «раён павінен быць сапраўды ператвораны ў вузлавы пункт практычнага ажыцьцяўленьня палітыкі партыі на вёсцы».

Прыцягнуць тысячы рабселькораў да перабудовы работы апарату

ЗВАРОТ ЦКК-НК РСІ ДА ДРУКУ БССР

Ажыцьцяўленьне дырэктывы партыі і ўраду аб ліквідацыі акруг і пераходзе на раённую сыстэму кіраўніцтва дало магчымасьць значна ажывіць дзейнасьць нізавых органаў, паскорыць тэмпы іх работы, пад высьць якасьць яе, наблізіць апараты да працоўных і ўцягнуць у работу нізавога апарату новыя масы рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства.

У выніку гэтай рэформы ўжо зараз мы маем рад буйнейшых дасягненьняў па ўсіх асноўных момантах работы нізавога апарату.

Аднак, маючыхся дасягненьняў далёка яшчэ недастаткова, каб сказаць, што на сёньняшні дзень поўнасьцю і цалкам ажыцьцёўлена дырэктыва партыі аб тым, што «раён павінен быць сапраўды ператвораны ў вузлавы пункт практычнага ажыцьцяўленьня палітыкі партыі на вёсцы», і што па лініі сельсаветаў праведзена «рашучае зьмяненьне зьместу і мэтадаў іх работы ў бок ўсё большага ахопу пытаньняў гаспадарчай і культурнай перабудовы вёскі». (Рэзалюц. XVI зьезду Усе КП(б).

Асабліва важна і кантроўна было-б атрыманьне матар'ялаў і прапаноў адносна ўдзелу працоўных мас у работе апарату і ў кантролі над ім (практыка шэфства, часовыя брыгады, сэкцыі, камісіі, іншыя формы) і адносна сацыялістычных форм і мэтадаў работы ў апараце (сац. спаборніцтва і ўдарніцтва; сустрэчныя пляны, буксірныя брыгады і інш.).

ЦКК-НК РСІ спадзяецца, што ўсе газэты і часопісы БССР сапраўды па бальшавіцку арганізуюць і правядуць наказаную работу і праз актыўны ўдзел тысяч рабселькораў дапамогуць пасьпяхова вырашыць дырэктывы партыі і ўраду па закранутых пытаньнях.

За Старшыню ЦКК. Нам. Наркома РСІ БССР ІВАНОЎ.

„Гастралёрства“—злачынная трата часу і сродкаў

Ліквідацыя акруг з перадачай усіх іх правоў і абавязкаў раёнам патрабуе ад рэспубліканскіх органаў так перабудаваць сваю работу, каб раёны адчувалі кіраўніцтва цэнтру і атрымалі-б яго своячасовую дапамогу. Як-ні-як, а пры існаваньні акруг перад раёнамі рад пытаньняў, вырашаемых у акрузе, зусім не паўставаў: па раду пытаньняў бліжэй і лягчэй можна было атрымаць дырэктывы, часьцей можна было езьдзіць у акругу і г. д.

Зараз-жа работа для раёну зрабілася іншай, больш самастойнай, але і больш складанай, больш поўнай, больш адказнай, а сувязь з кіруючым цэнтрам зрабілася больш цяжкай.

Але горш за ўсё калі ствараецца сувязь з раёнам, пасылаючы туды «гастралёраў» не для дапамогі ў рабоце, не для жывога інструктаваньня, а для мімалётнай пагуляначкі, з мэтай канстатаваньня промахаў і памылак.

Вось яркі прыклад гэткага гастралёрства. У Чачэрск (был. Гомельскай акругі), прыехаў з Менску работнік Белкамзету тав. Гінзбург. Пагуляў ён гадзіну па мястэчку, высьвятліў, як стаіць справа з гаспадарчай дапамогай местачковаму насельніцтву і пайшоў у РВК, дзе яраз застаў пасяджэньне прэзыдыуму. Тут ён паведаміў, што «у вас сродкі выдаткаваны няправільна», што «тут не прадуманы мерапрыемствы па разьмеркаваньні гэтай работы» і што «трэба стварыць камісію для ўсебаковай дэтальнай праверкі ўсіх мерапрыемстваў. Камісію стварылі і тады ён, апчасьлівіўшы РВК літаральна 5 хвіліным знаходжаньнем, разьвітаецца і адыходзіць. Старшыня створанай камісіі хапае яго за полы і просіць з ім пагутарыць: з чаго ім пачынаць, як падыйсьці, як працаваць і г. д. Тав. Гінзбург і рукамі і нагамі: «не, не, застацца ў вас ніяк не магу», я павінен сьпяшацца ў іншы раён, мая справа толькі сабраць весткі, а не інструктаваць і дапамагаць».

Трэба загадаць усім установам пасылаць сваіх прадстаўнікоў у раёны з абавязковай умовай там, на месцы дапамагаць наладжваць работу. Бадай было-б ня шкодна патрабаваць ад выяжджаючых у раёны прадстаўленьня водзываў аб атрыманай ад іх дапамозе тымі раённымі ўстановамі, у якіх яны пабывалі. З гастралёрствам-жа трэба змагацца, як са злачыннай тратай часу і сродкаў.

Хв.

Як Белкамунбанк дапамагаў прыватніку

Рашуча аздаравіць апарат Белкамунбанку

Праходзячая чыстка апарату Белкамунбанку выяўляе рад недахопаў і скрыўленьняў у працы банку.

Адным з такіх скрыўленьняў клясавай лініі ў рабоце банку зьяўляецца крэдытаваньне прыватнікаў, якое праводзілася на працягу некалькіх гадоў.

Зараз банкаўскія работнікі спрабуюць прыкрыць сувязь з прыватнікам «законнымі падставамі»—спасылаючыся на тое, што крэдытаваньне індывідуальнага жылбудаўніцтва прадугледжвалася ўлянамі зацьвярджаемымі ўрадавымі органамі, і адпаведнымі настановамі. Гэты «манэўр»--нікчэмная спроба людзей, страціўшых клясавае начуцьцё. Ні пляны крэдытаваньня, ні адпаведныя пастановы ўрадавых органаў аб індывідуальным жылбудаўніцтве не давалі права банку крэдытаваць спэкулянтаў-пазбаўленцаў, гандляроў, разбазарваць на карысьць прыватнаму сэктару дзяржаўных сродкі. Пастанова СНК БССР ад 17-IV-28 г. цьвёрда ўстанавіла сацыяльны склад індывідуальных забудоўшчыкаў, якім павінна была аказвацца дапамога.

А па практыцы мы маем грубое парушэньне пастаноў ураду блізкае да шкодніцтва. Назык у 1927-28 г. было выдана на індывідуальнае будаўніцтва 606 тыс. руб., у 28-29 г.—703 тыс. руб. з якіх 50 проц. папала клясава-варожым нам элемэнтам, гандляром, дамаўладальнікам жывучым з кватэрнай платы, пазбаўленцам і г. д.

Мала таго, што грошы выдаваліся прыватнікам. Значная частка выдаўных назык у суме 31.000 руб. была сьпісана банкам у страты. Банк не скарыстоўваў свайго права датэрміновага спагнаньня назыкі пры пратэрміноўцы плацяжу.

— Гэта не практыкавалася, — кажа Каган, галоўны бухгальтар банку,—а замест гэтага практыкавалася сьпісваньне ў страты па 1500—2000 руб. назык выданых спэкулянтам, пазбаўленцам.

Юрысконсульт банку Эстрына, якая павінна была сачыць за правільным ужываньнем закону адказвае, што «ня цікавілася гэтым пытаньнем, і наогул не разьбіраюся ў ім».

Эстрына і сапраўды многім чым ня цікавілася, ня цікавілася пытаньнем клясавай палітыкі.

Ідучы на сувязь з прыватнікам, і наносячы яўную страту дзяржаве, зьмяшае выдачу сродкаў аграмаджанаму сэктару, банк у афіцыйных дакумантах змазваў сапраўднае становішча з крэдытаваньнем індывідуальнага рабочага жыллёвага будаўніцтва, зазначаючы, што ў складзе індывідуальных забудоўшчыкаў рабочыя складаюць 90 проц. Сапраўды-ж пры праверцы аказалася, што члены саюзу, у складзе пазыкатрымальнікаў складаюць толькі 60 проц. Гэты яўна шкодніцкі факт гаворыць аб тым, што работнікі банку сьвядома ішлі на парушэньне дырэктыў ураду, маскуючы ўнасіміць у плян сумы на індывідуальнае рабочае жыллёвае будаўніцтва 90 проц. складам рабочых і проста ашуквае гэтым урадавыя органы.

Брыгадзір.

Аб мерапрыемствах па палепшаньні кіраўніцтва раёнамі з боку цэнтральных установаў

ПАСТАНОВА КАЛЕГІІ НК РСІ БЕЛ. АД 24-III 1931 ГОДУ.

Абсьледваньне нарыматаў і цэнтральных установаў БССР паказала зусім нездавальняючае становішча справы кіраўніцтва раёнамі.

Да гэтага часу адсутнічае дыфэрэнцыяцыя раёнаў па іх эканамічных адзнаках, у выніку чаго адсутнічае і дыфэрэнцыяваньне кіраўніцтва раёнамі.

Жывая сувязь і інструктаж раёнаў застаецца дагэтуль зусім неарганізаваным і неўпараджаваным (выпадковасьць, непляновасьць выездаў, дрэннае інструктаваньне, частыя выезды ў адны і тыя-ж раёны, застаўляючы без ахопу астатнія раёны).

У мэтах палепшаньня кіраўніцтва раёна жывой сувязі і інструктажу ўсім цэнтральным установам, якія маюць падпарадкаваныя раённыя зьвены—правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Да 10-IV г.г. увесьці ўнутры свайго апарату спэцыяльныя пасады інспэктароў (інструктароў) для ажыцьцяўленьня сыстэматычнай жывой сувязі з раёнамі і для правядзеньня праз іх сталага інструктажу сваіх раённых зьвеньняў.

Штат інспэктароў павінен быць укамплектаваны шляхам пераразмеркаваньня працаўнікоў унутры самой установы, не выходзячы за межы штатаў 1929-30 г. Непасрэднае кіраўніцтва інспэктарамі (інструктарамі)—ускладаецца на аднаго з кіруючых працаўнікоў установы (самаго кіраўніка, або яго намесьніка, члена калегіі, члена праўленьня).

2. Адзначаючы, што адсутнасьць дэталёвага даведніка-паказчыка аб раёнах БССР,—не дае магчымасьці правесьці дакладную дыфэрэнцыацыю раёнаў і прыстасавана да гэтага наладзіць неабходнае дыфэрэнцыяваньне кіраўніцтва раёнамі, зьвярнуць увагу прэзыдыуму ЦВК, што Дзяржплян да гэтага часу ня выканаў дырэктывы прэзыдыуму ад 30-X-30 аб паскораньні выданьня даведніка-паказчыка.

Прасіць прэзыдыум ЦВК патрабаваць ад Дзяржпляну выкананьня паказанай дырэктывы, вызначыўшы Дзяржпляну для выкананьня пэўны тэрмін.

3. Да выкананьня Дзяржплянам дырэктывы прэзыдыуму ЦВК аб выданьні даведніка-паказчыка аб раёнах БССР і да выпрацоўкі канчатковага гаспадарчага напрамку кожнага раёну, установы павінны правесьці дыфэрэнцыяцыю раёнаў на падставе сваіх ведамственных даных, з пункту погляду аднолькавасьці, блізкасьці, або падабенства ўмоў, стану раёнаў па тых ці іншых асноўных момантах дзейнасьці данага ведамства і на падставе гэтага стварыць групы аднолькавых (падобных) раёнаў. Прыстасавана да дыфэрэнцыяцыі раёнаў павінна быць наладжана і дыфэрэнцыяцыя кіраўніцтва імі (дача неаднолькавых для ўсіх дырэктыў і заданьняў, патрабаваньне неаднолькавых зьвестак і да т. п.).

Прымацаваньне раёнаў за інспэктарамі праводзіцца таксама на прынцыпу разьмеркаваньня паміж імі дыфэрэнцыяваных груп раёнаў.

Калі ва ўстанове немагчыма пакуль што правесьці чоткую дыфэрэнцыяцыю раёнаў—падзяленьне іх паміж інспэктарамі праводзіцца часова па тэрытарыяльным прынцыпе.

4. Каб кожны прадстаўнік цэнтральнае ўстановы аказваў раённым органам максымальную карысьць па ўсіх момантах дзейнасьці данае ўстановы, а ня толькі выключна па адным якім-небудзь пытаньні: неабходна кожны выезд у раён скарыстоўваць максымальным чынам,—даручыць правесьці інструктаваньне па розных пытаньнях, высьветліць, або вырашыць тыя ці іншыя пытаньні, даць паказаньні, адвесьці матар'ялы, забраць там зьвесткі і г.д.

Для гэтага аб кожным выезьдзе загадзя вывешваць аб'явы, куды, калі, хто едзе і абавязаць увесь апарат рыхтаваць для ад'яжджаючых усе даручэньні. Акрамя дачы выяжджаючаму кожны раз паасобных розных даручэньняў,—у кожнай установе павінны быць намечаны некалькі асноўных момантаў дзейнасьці данага ведамства, па якім выяжджаючыя абавязкова і без асобных напамінкаў заўсёды праводзяць у раёнах высьвятленьне, інструктаж і арганізацыйную дапамогу.

5. Абавязаць усіх выяжджаючых у раёны для абсьледваньняў і праверак складаць адпаведныя вывады і прапановы, узгадняць іх з мясцовымі органамі, застаўляць ім для кіраўніцтва і выкананьня і перадаваць апарату сваёй (цэнтральнай) установы.

Тыя пытаньні, вырашыць якія даны прадстаўнік ня мае паўнамоцтва, а так сама і спрэчныя з мясцовымі органамі прапановы — перадаюцца на вырашэньне кіраўніку той часткі ўстановы, да якой датычаць даныя пытаньні.

6. Увесь інспэктарскі (інструктарскі) склад, які ажыцьцяўляе жывую сувязь з раёнамі, павінен пэрыядычна ў пэўны час зьбірацца разам у цэнтр для нарад па абгаварэньні вынікаў працы, для абмену вопытам, устанаўленьня лепшых мэтадаў жывога інструктажу і г. д., а таксама для азнаямленьня і прапрацоўкі дырэктыўнага матар'ялу і новых заданьняў.

7. У мэтах распаўсюджваньня вопыту лепшай работы аднаго раёну на іншыя,—увесьці ў практыку наведамленьне аднолькавым альбо падобным раёнам лепшых прыкладаў, дасягнутых у тым, ці іншым раёне, а таксама і па ведамленьне іншым раёнам вывадаў, прапаноў і праведзеных у выніку абсьледваньня мерапрыемстваў для таго, каб вынікі абсьледваньня аднаго раёну абавязкова скарыстоўваліся і іншымі на тых момантах, якія зьяўляюцца падобнымі і для іх.

8. У мэтах рашучага вынішчэньня разнабою і паралелізму, шматлікага дзаньня адных раёнаў і застаўленьня без усякай сувязі другіх у мэтах максымальна-рацыянальнага скарыстаньня ўсіх выездаў з цэнтра і плянамернага абслугоўваньня раёнаў,—абсьледваньне і праверку дзейнасьці раённых органаў праводзіць на наступных прынцыпах:

а) кожная цэнтральная ўстанова складае плян абсьледвацельскіх (праверачных) выездаў (калі, дзе, па якіх момантах будзе абсьледваньне).

б) Унутры цэлага ведамства (НКСнаб, ВСНГ, НКФ, НКЗем і інш.) пляны па кожнай паасобнай галіне (Белрыба, Белмяса, Белагародніна і г. д.)—зьвязваюцца з планам абсьледваньняў агульна-кіруючага ведамственнага органу і на падставе гэтага складаюцца адзіныя пляны па ўсім ведамстве.

в) Пляны абсьледваньняў (праверкі) раёнаў ведамствы паведамляюць НК РСІ для зацьвярджаньня і ўвязкі іх з адзіным абсьледвацельскі плян БССР.

г) Як пры ўвязцы плянаў унутры ведамства, так, асабліва пры ўвязцы ведамственных плянаў у НК РСІ—неабходна шырока практыкаваць арганізацыю комплексных абсьледваньняў шляхам адначасовага выезду ў раёны аб'яднанай брыгады прадстаўнікоў некалькіх установаў, альбо некалькіх частак аднаго ведамства, складаньні ўвязанай праграмы, узгадненьня арганізацыі і мэтадаў работы, скарыстаньня ўжо маючыхся матар'ялаў і г. д.

д) Забараніць з 10-IV г.г. ўсім ведамствам праводзіць абсьледваньні раённых органаў без дазволу кантрольна плянавага бюро НК РСІ і прапанаваць РКК-РСІ паведамляць НК РСІ аб усіх выпадках недазволеных абсьледваньняў, з правам у тых выпадках, калі гэта будзе выклікацца патрэбнасьцю, зусім не дапускаць на месцы гэткіх абсьледваньняў.

Увага: Гэтая пастанова не датычыцца выездаў па апэрацыйных заданьнях, не патрабуючых абсьледваньняў або праверкі дзейнасьці раённых органаў.

9. Пабудаваць працу апарату такім чынам, каб усякага роду гаспадарчыя, фінансавыя, загатоўчыя і інш. лічбовыя заданьні раёнам даваліся на адзіным цьвёрдым пляне, які спускаецца ў раён адзін раз.

У межах аднаго ведамства гэты плян зводзіцца агульна-кіруючай ведамственнай установай і ёю даецца раёнам, а калі ён патрабуе зацьвярджаньня вышэйшых органаў ці ўвязкі ў Дзяржпляне, ён прадстаўляецца ў апошнія таксама адзін раз — у відзе адзінага цьвёрдага пляну.

10. У мэтах раўнамернай нагрузкі раённых зьвеньняў даручэньнямі розных частак цэнтральных установаў і дачы раёнам пасільных нагрузак—усякага роду арганізацыйныя заданьні, якія даюцца паасобным раённым зьвеньням—розным часткамі цэнтральных установаў праходзяць праз інспэктароў адведна прымацаваных да раёнаў альбо іх кіраўніка.

11. Практыка скліканьня куставых, нарад раённых працаўнікоў, апраўдаўшая сябе на шэрагу ведамстваў,—павінна быць перанесена ва ўсе ведамствы.

Гэткія нарады павінны вытварацца ў плянавым парадку і з загадзя падрыхтаванымі і разасланымі матар'ялямі (тэзісы, праекты прапаноў, лічбы і інш.).

12. Арганізаваць поўнае абслугоўваньне ўсімі часткамі апарату прыяжджаючых з месц працаўнікоў паказаньнямі і інструктажам па ўсіх пытаньнях працы раённых зьвеньняў, а таксама і скарыстаньне іх прыезду для атрыманьня рознага роду даных па раёне.

У мэтах гэтага рабіць апавяшчэньні ўсяму апарату (аб'ява, абход і інш.) аб прыездах, патрабаваць падрыхтоўкі матар'ялаў, абавязаць праводзіць гутаркі і г. д.

13. Для мэты вучоту і кантролю жывой сувязі з раёнамі, завесьці на кожны раён адзіную картку, у якой адзначаць, хто, калі, па якіх асноўных заданьнях паехаў у даны раён і хто, калі, чаго прыяжджаў з працаўнікоў гэтага раёну.

14. Выходзячы з таго, што некаторыя цэнтральныя ўстановы не цалкам яшчэ перадалі раёнам правы па вырашэньні шэрагу пытаньняў—абавязаць цэнтральныя ўстановы да 10-IV г.г. перагледзець кола сваіх функцый і канчаткова перадаць раёнам усе апэрацыйныя функцыі і адпаведныя правы, павялічыўшы гэтым самастойнасьць раённых органаў і пакінуўшы за сабой плянаваньне, кантроль і інструктаж.

15. Пасьля пастаноўкі паказальнага РВК, на падставе матар'ялу, які будзе атрыманы і праверены на месцы—Савецкай групе і Вопытнай станцыі яшчэ раз праверыць пастаноўку кіраўніцтва раёнамі і распрацаваць дадатковыя мерапрыемствы па яго палепшаньні.

16. Прапанаваць РКК-РСІ і раённым установам наогул, прыстасавальна да ўмоў раёнаў—пабудаваць кіраўніцтва сельсаветамі і нізавымі органамі на такіх-жа агульных падставах.

17. Пастанову надрукаваць у «Савецкай Беларусі» і бюлетэні СНК.

Нарком РСІ БССР Калін.

Ударнай калёнай у далейшы сацыялістычны наступ*)

(Да вынікаў III Усебеларускага настаўніцкага зьезду)

III Усебеларускі настаўніцкі зьезд ня быў выключна настаўніцкім зьездам. На гэтым зьезьдзе апроч настаўнікаў-ударнікаў прысутнічалі і прымалі самы актыўны ўдзел ва ўсёй рабоце зьезду ўдарнікі-рабочыя, ударнікі-калгасьнікі. Ды яно інакш і не магло быць. Нельга ўявіць сабе савецкае настаўніцтва, якое ня было-б у сваёй рабоце зьвязана з пралетарскімі і працоўнымі масамі, якое-б лічыла справу ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыі непісьменнасьці, політэхнізацыі, падрыхтоўку кадраў справай выключна настаўніцтва. Асноўная маса ўсяго настаўніцтва БССР зьвязала свой лёс з пралетарыятам, стаіць на пралетарскім шляху, поплеч з пралетарыятам рука аб руку з ім, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, змагаецца за ўдарныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва супроць клясавых ворагаў, кулака і яго агентуры правых і «леваў» апартуністаў.

З якім-жа бляскам прыйшло настаўніцтва БССР да свайго III Усебеларускага зьезду? На свой III Усебеларускі зьезд настаўніцтва прыйшло з вялізарным актывам у сваім балянсе. Вырасла ў два разы армія настаўнікаў БССР. Калі ў сваіх радах да II Усебеларускага зьезду настаўніцтва налічвала каля 9.000 чалавек, дык да III зьезду настаўнікоў БССР налічваецца ўжо каля 20.000. Павялічэньне ліку настаўнікаў сьведчыць аб вялізарным павялічэньні ахопу навучаньнем дзяцей рабочых і працоўных мас. Толькі на ўмовах пралетарскай дзяржавы, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту магчымы такі бурны ўздым культурнага будаўніцтва, які маецца ў нас у БССР.

Адначасова з ростам колькаснага складу настаўніцтва палепшалася і яго якасьць, на 1 студзеня 1931 г. у 15 раёнах партыйна-камсамольская праслойка настаўніцтва складае ад 20 да 35 проц. За гэтыя гады ўвесь час ішоў працэс прыліву новага складу настаўніцтва, якое скончыла савецкія педагагічныя навучальныя ўстановы. Значна ўзрасла праслойка настаўнікаў, выхадцаў з пралетарскага, батрацка-бядняцкага сяродку, пры адначасовым рэзкім зьмяншэньні праслойкі настаўніцтва з социяльна-чужога, клясава-варожага асяродку (дзеці памешчыкаў, папоў, гандляроў, кулакоў і т. д.). Абнастрэньне клясавай барацьбы паглыбіла палітычную дэфэрэнцыяцыю і ў радох настаўніцтва. Да III Усебеларускага настаўніцкага зьезду яскрава выкрышталізаваліся два процілеглыя полюсы. Адзін полюс—гэта асноўная маса настаўніцтва, якая пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі актыўна працуе ня толькі ля свайго варштату, у школе, у культустановах, але і на грамадзкай рабоце. Другі полюс—гэта невялічкая частка настаўніцтва, настаўніцтва, якое выпадкова трапіла, прымазалася ў рады савецкага настаўніцтва. Гэта тая частка настаўніцтва, на якую абапіраліся ў сваёй контррэвалюцыйнай дзейнасьці беларускія нацыянал-дэмакраты, адкуль яны чарпалі сваіх прыхільнікаў. З гэтага лягеру кулакі вербавалі сваіх абаронцаў. З гэтага лягеру былі чутны галасы супроць індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскае гаспадаркі, супроць сацыялістычнага наступленьня, супроць дыктатуры пралетарыяту.

III Усебеларускі настаўніцкі зьезд асаблівую ўвагу аддаў нацыянальнаму пытаньню. Чырвоный штужкай на зьезьдзе праз ўсе даклады і спрэчкі па ім прыходзіла нацыянальнае пытаньне. Зьезд з вялікім здавальненем адзначаў, што вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР зьяўляюцца вынікам ленінскага вырашэньня нацыянальнага пытаньня КП(б)Б і яе ЦК. Пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне і кіраўніцтва нацыянальнай палітыкі КП(б)Б забясьпечыў росквіт культурнага будаўніцтва БССР нацыянальнага па форме, сацыялістычнага па сваім зьмесьце.

На III зьезьдзе прысутнічалі настаўнікі, прадстаўнікі брацкох савецкіх нацыянальных рэспублік, аўтаномных вобласьцяй (Украіны, Башкірыі, Мардовіі), якія ў сваіх выступленьнях фактамі, лічбамі паказвалі як растуць, мацнеюць брацкія савецкія рэспублікі, як пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пасьпяхова ліквідавана праклятая спадчына мінулага—нацыянальная рознь, як узрастае нябачаным тэмпамі культурны ўзровень, матар'яльны дабрабыт трыгечаных пры царызьме рабочых, працоўных розных нацыянальнасьцяй.

І калі асноўная маса настаўніцтва на спробы контррэвалюцыйных беларускіх нацыянал-дэмакратаў перацягнуць яе на свой бок, адказала рашучым адпорам нацыянал-дэмакратам у час шкодніцкай дзейнасьці Некрашэвіча, Лёсікаў, Ластоўскіх і К°, дык на самым зьезьдзе беларускі контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм атрымаў яшчэ больш руйнуючы ўдар. З ўсёй яскравасьцю былі выкрыты сацыяльныя карэньні нацыянал-дэмакратызму. Бязьмежнае абурэньне ахапляла кожнага дэлегата зьезду, калі падаваліся тыя ці іншыя агідныя, контррэвалюцыйны факты дзейнасьці нацыянал-дэмакратаў.

У адказ на прошукі нацдэмаў зьезд абвясьціў сябе мабілізаваным на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Зьезд прыняў пастанову «лічыць несумяшчальным пратаганду нацдэмаўскіх поглядаў з прабываньнем у радох саюзу, на рабоце ў навучальных установах». Мабілізуючы сябе і ўсё савецкае настаўніцтва на бязьлітасную барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, зьезд сканцентраваў агонь на вялікадзяржаўным нацыянізьме, як найбольш небясьпечным у даны пэрыяд.

III Усебеларускі настаўніцкі зьезд быў зьездам інтэрнацыянальнай салідарнасьці. Савецкае настаўніцтва 16 розных нацыянальнасьцяй—была адзіная сям'я. Зьезд з вялікай зацікаўленасьцю заслухаў прамовы былых паслоў у польскі сойм т. т. Рак-Міхайлоўскага, Бурсевіча, якія падалі жудасны малюнак сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня рабочых і працоўных мас Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Зьезд рашуча пратэставаў супроць нагромаў, крывавых жудасных катаваньняў, якімі польскі фашызм думае задушыць узрастаючы рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне і Польшчы. Праз галовы польскага фашызму савецкае настаўніцтва БССР у асобе свайго III зьезду зьвярнулася з адозвай да таго настаўніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якое ідзе пад сьцягам брацкіх камуністычных партый разам з пралетарыятам на шляху перамогі пралетарскай рэвалюцыі.

Асноўным актуальнейшым пытаньнем на III зьезьдзе было пытаньне аб задачах настаўніцтва ў рэканструкцыйны пэрыяд. Наша краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму. Пытаньне «хто-кого» вырашана ў прамысловасьці на карысьць сацыялізму. У нашай краіне завяршаецца пабудова фундамэнту сацыялістычнай эканомікі. Цэнтральнай фігурай, асноўнай і галоўнай апорай партыі на вёсцы зьяўляецца калгасьнік. Ліквідуецца кулацтва як кляса на базе суцэльнай калектывізацыі.

Уздымам творчага энтузіязму, рэвалюцыйнымі формамі і мэтадамі, хваляй сацпаборніцтва, ударніцтва, скразнымі брыгадамі, грамадзкім буксірам—адказвае пралетарыят на заклік сваёй партыі. Усе пастановы зьезду як-раз і накіраваны на тое, каб чырвоно насьпяжнае настаўніцтва БССР з яшчэ большай напружанасьцю энэргіяй працавала на тых вучастках работа, куды яно настаўлена камуністычнай партыяй і ўрадам. У свой час асноўная маса настаўніцтва дала адзінае цвёрдае партыі быць яе лепшым агітпропам на вёсцы. Па ўдзеле ва ўсеагульным навучаньні, ліквідацыі непісьменнасьці, удзеле ў першай бальшавіцкай вясьне асноўная маса настаўніцтва вытрымала палітычны экзамен. У асобе свайго III зьезду савецкае настаўніцтва БССР моцна ўдарыла па аналітычнасьці, неўпрэльнасьці, абвясьціўшы іх непасрэднай дапамогай клясаваму ворагу, контррэвалюцыі, інтэрвэнтам. У асобе свайго III зьезду савецкае настаўніцтва казала, што зараз ня можа сябе лічыць, ня можа належыць да савецкага настаўніцтва той настаўнік, які замкнецца ў сваёй скарлупе, ня будзе зьвязаны з пралетарскай савецкай грамадзкасьцю, які будзе стаяць у баку ад вялізарных зрухаў у нашай краіне, які ня будзе прымаць актыўнага ўдзелу ў пабудове сацыялізму. Асноўная фігура настаўніцтва—гэта настаўнік-ударнік у школе, ударнік у грамадзкай рабоце, актыўны змагар за справу пралетарскай рэвалюцыі, настаўнік, які нічыльна зьвязаны з рабочым, калгасьнікам, які пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі па-бальш

ЖОРСТКІ КАНТРОЛЬ РУБЛЕМ—

основа крэдытна-фінансавай рэформы, забяспечанасьць выкананьня гаспадарчых плянаў, пераход работы гаспадарчых прадпрыемстваў і ўстаноў на гаспадарчы разрахунак

Неадкладна ўключыцца ў ліквідацыю прарываў фінпляну першага кварталу. Да дню тыражу ніводнага рабочага, служачага, калгасьніка, бедняка і серадняка без аблігацыі пазыкі

Рэалізацыя пазыкі—адзін з паступовых крокаў укараненьня дзяржкрэдыту ў гушчы прац ўсіх

8-га красавіка 1931 г у Растове н/Дону адбудзецца першы тыраж выйгрышу на пазыцы «Пяцігодка—у чатыры гады».

Рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка» была адным з паступовых крокаў на шляху пасьляховага ўкараненьня дзяржкрэдыту ў гушчу працоўных мас Савецкага Саюзу, якасьці ныпушчана на матэрыяльнай пралетарыяту і пера даюга сялянства Савецкага Саюзу.

Рэалізацыя пазыкі зьявілася дэманстрацыяй пралетарыяту, яко жадае ня толькі сваёй непружнай работай, але і сваімі сродкамі садзейнічаць пайхутчэйшай пабудове сацыялізму ў краіне саветаў.

Тое становішча, што цэлы рад гарадоў і раёнаў ужо перавыканалі завяшчаныя контрольныя лічбы па пазыцы і яшчэ праводзяць падпіску, лішні раз сьведчыць аб тых буйных рэзэрвах, якія ў мас маюцца для развіцьця ўнутранага дзяржкрэдыту і аб клясава-пралетарскай сьвядомасьці рабочае клясы і сялянства.

Адзак, побач з добрымі выніксмі рэалізацыі пазыкі сярод працоўных гораду (105 проц. выкананьня кантрольнай лічбы) на шасобных вучастках пазыковага фронту мы маем значныя адрывы.

Асабліва дрэнна абстаіць справа у адносінах вёскі. (48 проц. выкананьня кантрольнага заданьня). Тэмпы разьмяшчэньня пазыкі ў вёсцы адрываюцца з горадам зусім нездавальняючымі. Разам з тым пры агульным адставаньні вёскі, мы маем раёны, якія далі добрыя выніксі рэалізацыі пазыкі сярод сялянства.

Дрэнныя выніксі рэалізацыі пазыкі на вёсцы зьяўляюцца вынікам адсутнасьці шырока разгорнутай масавай работы, уласкі пазыковай кампаніі з іншымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, адсутнасьці рашучага адпору кулацкай агітацыі супроць пазыкі. Таксама недастаткова яшчэ пастаўлена на практыцы вядучая роля калгасаў і саўгасаў у разьмяшчэньні пазыкі,— іх узьдзейнічаньне на адзіласобнікаў.

Тыраж выйгрышаў «Пяцігодка—у чатыры гады» павінен сканцэнтраваць увагу шырокіх працоўных мас на ролі і задачах пазык у фінансаваньні сацыялістычнага будаўніцтва, разам з тым, ён будзе яскравым паказьніком тых выгад, якія атрымліваюць трымальнікі пазык.

Апошняе асабліва важна таму, што надходзячы тыраж датычыцца ня толькі новых падпісчыкаў на пазыку «Пяцігодка», але і ўсіх трымальнікаў 3-й пазыкі індустрыялізацыі, а таксама трымальнікаў 1-ай і II-ой пазыкі індустр. пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, аблігацыі якіх абменены на пазыку «Пяцігодка—у чатыры гады».

Тыраж, у якім будзе разыграна вялізарная колькасьць выйгрышаў (каля 250 тысяч) из вельмі вялікую суму (звыш 50 млн. руб.), будзе закрэплены шматлікімі ўзмацненьнямі надпісчыкаў.

Таму належная падрыхтоўка да тыражу выйгрышаў зьяўляецца вельмі важным этапам у пазыковай кампаніі. **Фінорганы, апчадкасы, крэдытныя** ўстановы, якасьці садзейнічаньня дзяржкрэдыту павінны рашуча ўзяцца за работу на папулярызацыі тыражу і ма білізаваць вакол гэтай работы шырокія колы савецкай грамадзянасьці.

Неабходна правесьці інфармацыйную работу такім чынам, каб кожны пазыкатрымальнік у самых далёких кутох нашай рэспублікі ведаў аб тыражы і мог даведацца па табліцах аб выйгрышы.

Зараз перад савецкай грамадзянасьцю стаіць баявая задача дабіцца да часу тыражу поўнага выкананьня канкрэтных заданьняў па пазыцы, якія даны асасобным раёнам і с.-саветам. **Раёны павінны прысьці да тыражу з рапартам аб 100-процантным выкананьні кантрольнай лічбы на рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—у чатыры гады»— такі павінен быць лёзунг падрыхтоўкі да тыражу выйгрышаў пожнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту.**

Не абмежоўваючыся выкананьнем заданьняў па пазыцы, неабходна дабіцца поўнага паступленьня ўсіх належных узносаў па падпісцы і выплачэньні ўсіх прагрэсіўнасьцяў і затрымаваньняў. Для ўсяго гэтага неабходна зараз-жа разгарнуць шырокую кампанію самаправеркі ў кожным прадпрыемстве, установе, у кожным калгасе, саўгасе і сельсавеце.

Неабходна дабіцца, каб да тыражу за кожным падпісчыкам былі замацаваны і пазбаўлены яму нумары аблігацый, на суму яго падпіскі. **Замацаваньне аблігацыі зьяўляецца адной з сур'ёзных і адказных задач апчадкас, аддзяленьняў Дзяржбанку, камісій садзейнічаньня, сельсаветаў і адміністрацый прадпрыемстваў і ўстаноў.**

Неабходна зараз-жа правесьці абмен аблігацый I-ай і II-ой пазыкі індустр. і пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на пазыку «Пяцігодка», бо калі абмен гэтых пазык да тыражу зроблен ня будзе, тэтыя трымальнікі будуць пазбаўлены магчымасьці ўдзельнічаць у тыражы.

Надыходзячы тыраж павінен замацаваць новыя посьпехі дзяржкрэдыту і садзейнічаць далейшаму іх узмацненьню.

Падхопім ініцыятыву дынамаўцаў

Арганізаваць „дзень праверкі" рэалізацыі пазыкі

Па ініцыятыве рабочых Маскоўскага заводу «Дынамо» у сакавіку па гор. Маскве будзе праведзена аднадзённая праверка падрыхтоўкі ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў да 1-га тыражу выйгрышаў на пазыцы «Пяцігодка—у чатыры гады».

Праверка павінна выявіць:

1. Ці мацуюцца 100-процантны ахоп падпіскай на пазыку ўсіх працоўных данага калектыву.
2. Ці поўнасьцю афармлена падпіска ў крэдытнай установе.
3. Ці праведзена замацаваньне №№ аблігацый за падпісчыкамі і выдача іх на рукі падпісчыкам.
4. Ці праведзены дамеры 1 і 2 пазыка індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадарки на пазыку «Пяцігодка».

Самаправерка павінна праводзіцца парт'ячэйкамі, зайкомамі, камсодамі з прыцягненьнем актыву прадпрыемстваў і ўстаноў.

Прадпрыемствы і ўстановы гор. Менску і іншых гарадоў БССР скарыстаюцца вопыт дынамаўцаў!

Уключымся ў самаправерку—разгорнем сацспаборніцтва паміж гарадамі, раёнамі, прадпрыемствамі, вёскамі і калгасамі на лепшую падрыхтоўку да тыражу. Шырока папярым іншых тыну перадавога пралетарыяту СССР.

Да першага тыражу выйграшаў пазыкі «Пяцігодка—у 4 гады» не павінна застацца ніводнага працоўнага без аблігацыі пазыкі.

В.

За жорсткую фінансавую дысцыпліну ўстаноў і прадпрыемстваў

Правесьці гаспадарчую работу рублём

ЦКК НК РСІ распачата на ўсёй БССР праверка сапраўднага становішча заснаваньня крэдытна-фінансавай дысцыпліны дзяржаўнымі, гаспадарчымі і грамадзкімі арганізацыямі. Адначасова арганізавана масавае абсьледаваньне на 39 цэнтральных установах і прадпрыемствах г. Менску, галоўным чынам, на гаспадарчых установах.

Неабходнасьць гэткай масавай і сыстэматычнай праверкі, як у цэнтры, так і на месах выклікана вельмі частымі выпадкамі грубага парушэньня крэдытна-фінансавай дысцыпліны:

Сакрытныя мэтавых асыгнаваньняў не на прызначаныя, невыканаўне установай праграмы ў той час як адпушчаны сродкі цалком выдаткаваны, вялікая запазычанасьць па падсправа здачных сумах, масавая выдача авансаў у лік пэнсіі і вялікія накапленьні грашовых сродкаў у касах устаноў.

Перад праверкай пастаўлены дзьве асноўныя задачы, менавіта: выявіць прычыны гэткіх парушэньняў з тым, каб у выніку гэтага правесьці неабходныя мерапрыемствы, якія б садзейнічалі далейшаму ўзмацненьню крэдытна - фінансавай дысцыпліны. Па-другое, выявіць непасрэдных асоб, якія наўмысьля, або па сваёй нядбайнасьці, дапушчаюць грубыя парушэньні фіндысцыпліны.

Праверка выявіць наколькі ў сапраўднасьці зьяўляюцца адказнымі кіраўнікі і галоўбухі устаноў у адносінах заснаваньня фіндысцыпліны. Уся плана савецкая грамадзкасьць павінна як мага хутчэй уключыцца ў барацьбу на фінансавым фронце каб дабіцца сапраўднага пералому ў справе ўмацаваньня фіндысцыпліны на ўсіх вучастках гаспадарчага будаўніцтва.

Нельга абмежыць маўчаньнем вялізарнай ролі фінорганаў у справе сыгналізацыі і папярэджаньня ўсякіх парушэньняў фінансавай дысцыпліны. Між тым, нажаль прыходзіцца канстатаваць, што апошнія яшчэ зусім мала зрабілі па сумясьці гэтай справы. Ні НКФ, ні Дзяржбанк да гэтага часу нічога не зрабілі на выкананьні заданьня ЦКК НК РСІ у частцы сыстэматычнай праверкі фіндысцыпліны.

Гэтую задачу павінны ўзяць на сябе, у першую чаргу, самі ўстановы, а таксама мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі. Прычым трэба памятаць што гэта работа зьяўляецца не аднаразовай кампаніяй, а сыстэматычнай, штодзённай у барацьбе за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі.

Ва ўмовах напружанай барацьбы за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады ўсякае парушэньне фіндысцыпліны зьяўляецца вялікай перашкодай у пасьляховым сацбудаўніцтве.

А.

Дабіцца рашучага пералому

Да канца кварталу ліквідаваць прарывы на фінансавым фронце

Бесьперабойнае фінансаваньне бліжэйшых гаспадарча-палітычных кампаній, як разгортваньне капітальнага будаўніцтва, пасеўная веснавая кампанія і кантрактацыя,—асноўная задача 1-га кварталу ў галіне фінансавага плану. У першым квартале павінна быць забясьпечана ня толькі бесьперабойнае здавальненьне чарговых гаспадарчых патрэб, але павінен быць накоплены значны рэзэрв для фінансаваньня шырокай праграмы гаспадарчага будаўніцтва другога кварталу.

Задачы гэтыя патрабуюць поўнага выкананьня фінансавага плану першага кварталу. Весткі аб выкананьні плану мабілізацыі сродкаў на 20 сакавіка, які выказаны ўсяго на 60,8 проц. сьведчаць аб тым, што на радзе вучастках і па шасобных раёнах месца рэзкае адставаньне.

Значна адстае ад плану паступленьне ўзносаў па пазыцы «Пяцігодка» (53,2 проц.) і прыёму укладаў у касы апчадкасьці (63 проц.). Зусім недастаткоўныя выніксі вызначаюцца па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру (21,6 проц.).

Спажывецкая кааперацыя ня толькі не дабілася станоўчага пералому ў справе выкананьня плану мабілізацыі сродкаў, а наадварот, з кожнай дэкадай дае ўсё горшыя выніксі. Плян збору паявых узносаў па вёсцы выкананы на 20 сакавіка толькі на 41,1 проц.

З шасобных раёнаў ідуць упарадзе: Ельскі, Касьцюковіцкі, Любанскі, Магілеўскі, Парыцкі, Слуцкі, Бабруйскі, якія выканалі квартальны плян звыш 70 проц.

Ганебна цягнуцца ў хвасьце: Азырыцкі, Асьпейскі, Бешанковіцкі, Буда-Кашалёўскі, Ветрынскі, Грэскі, Дуброўенскі, і інш., якія выканалі квартальны плян **менш чым на 50 проц.**

Астатнія раёны выканалі квартальны плян ад 50 да 70 проц.

Апартуністычна маўчаць і не дасьляюць зьнестаж Жыткавіцкі, Камарынскі, Халопеніцкі і Чарэйскі раёны.

Чым можна тлумачыць гэтае экзатнае разыходжаньне ў выкананьні пляну па шасобных раёнах? Выключна тым, што раённыя кіраўніцтвы, фінансавы апарат і грамадзкія арганізацыі на справе не ажыцьцяўляюць дырэктыў партыі, ча месцох яшчэ ня выкарчаваны апартуністычныя недацэнжа значэньня фінансавай работы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. Толькі пяўменьнем стаць на чале працоўнага ўэдыму і мабілізаваць іх актыўнасьць на вырашэньне фінансавых задач, апартуністычна-самацэнтрыцкі настроі можна тлумачыць факт выкананьня пляну менш чым на 50 проц.

Да канца кварталу засталося толькі некалькі дзён. Фінансавыя органы павінны сапраўды ўдарнымі тэмпамі работы, шырокай мабілізацыяй грамадзкасьці, разгортваньнем сацыялістычных мэтадаў барацьбы за плян, рашучай барацьбой з кулацкім супраціўленьнем і злосным апітацыяй кулацкаэлемянскіх элементаў, дабіцца поўнага выкананьня пляну. Партарганізацыі і савецкая грамадзкасьць павінны ўсямерна дапамагчы фінансавым органам у вырашэньні фінансавых задач 1-га кварталу.

І.

Звотка выкананьня пляну мобілізацыі сродкаў на 20 сакавіка 1931 г.

Назва пляцяжоў	проц. выкан. кварт. заданьня
1. Простыя ашчадкі	74,6
2. Пазыка „Пяцігодка"	53,2
3. Рыначныя пазыкі	52,9
4. Уклады ў ашчадкасы	63 0
5. Мэтавыя пазыкі	69,8
6. Сельска-гаспад. крэдыт	75,5
7. Акцыі Трактарацэнтру	21,6
8. Паявыя ўзносы ў ЦРК	95,8
9. Паявыя ўзносы ў райспаж. т.-вы	41,1
10. Уклады і мэтавыя ўзносы ў РСТ-вы	66,7
11. Сампрамкаапэрацыі	56,6
12. Жыльлёвая каапэрацыя	61,5
13. Рыбная каапэрацыя	30,0
14. Інвалідная каапэрацыя	81,8
15. Культзбор: горад	58,2
„ вёска	98,3
16. Ільнаканапляводчая каапэрацыя	7,0
17. Малочна-жывёлагадо чая	6,3
18. Садова-гародная каапэрацыя	7,5
19. Калгассыстэма	31,4
Усяго па БССР	60,8



Адгрузка трактараў для МТС з заводу імя Дзяржынскага.

СУСЬВЕТНЫ ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС— КРЫЗІС КАПІТАЛІЗМУ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА

Масавае скарачэньне зарплаты ў ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК, 10. Паводле даных міністэрства працы Злучаных Штатаў, скарачэньне зарплаты ў лютым праведзена **335 фірмамі** і закрануло **43.000** рабочых. Гэтыя лічбы зьяўляюцца рэкордным, бо да гэтага часу нават у самы няспрыяючы ў гэтых адносінах месяц (жнівень 1930 г.) скарачэньне зарплаты было праведзена толькі **133 фірмамі** ў адносінах да **24.700 рабочых.**

Згодна заяве прадстаўніка амэрыканскай фэдэрацыі працы Грына сярэдні заработак фабрычных рабочых у параўнаньні з 1929 годам зьменшыўся на 37 процантаў, а чыгуначнікаў на 21 проц.

Беспрацоўе у Нямеччыне расьце

БЭРЛІН, 24. Палажэньне на рынку працы ў Нямеччыне не палепшаецца. Да 15 сакавіка ніводзе афіцыйных даных зарэгістравана 4 мільёны 980.000 беспрацоўных. Дапамогу атрымліваюць толькі 2 мільёны 589.000 беспрацоўных. Лік асоб, якія атрымліваюць так званую «крызісную дапамогу» скаіў у сярэдзіне сакавіка 949.000.

Нязначны лік беспрацоўных перагулярна атрымліваюць дапамогу ў нарадку дабрачынасьці. Каля 30 проц. беспрацоўных не атрымліваюць ніякай дапамогі.

Урад Брунінга падрыхтоўвае новы націск на беспрацоўных

БЭРЛІН, 24. У артыкуле аб палажэньні ў рэйхстагу і намерах ураду Брунінга «Ротэ Фанэ» піша: «не пазьней суботы 29 сакавіка, рэйхстаг будзе распушчан на вакацыі.

Роспуск на вакацыі адбываецца ў момант, калі наопераджі ўсім надзвычайным мерам, фінансавае палажэньне Нямеччыны, пры дэфіцыце ў суме звыш 1 мільярда марак, зьяўляецца больш катастрофічным, чым калі небудзь, а цэлы рад важных сац. і палітычных пытаньняў застаецца ня вырашэньным. Як відаць па гэтаму, Брунінг патрабуе роспуску рэйхстагу на 6 месяцаў, каб пры дапамозе новых надзвычайных законаў праводзіць дыктатуру на свой погляд. Урадавыя партыі ўжо дагаварыліся з сац-дэмакратыяй аб тым, каб урад быў упаўнаважаны правесьці, ня лічачыся з поглядамі рэйхстагу, у часе летняга перарыву «меры эканоміі».

Зусім зразумела, што гутарка ідзе не аб чым іншым, як аб прадастаўленьні праў для правядзеньня новага нябачанага націску на беспрацоўных.

Нямеччына і антысавецкі фронт

Інтэрвью генерала фон-Гешам

ПАРЫЖ. «Эксцэльсіор» публікуе інтэрвью свайго берлінскага супрацоўніка з генералам фон-Гешам аб эканамічным і палітычным палажэньні Нямеччыны.

На пытаньне супрацоўніка: «ці ня кінецца Нямеччына ў абдымкі Савецкай Расіі, калі яна канчаткова адмовіцца ад заходняя-эўропейскіх дзяржаў?—фон-Геш зазнаў: «калі буйныя заходнія - эўропейскія дзяржавы гэтага пажадаюць, Нямеччына магла-б паслужыць заслонай супроць бальшавіцкага наступу, пагражаючага Эўропе. Аднак, Нямеччына, абяздолеўшая, бясьсільная страціўшая роўнавагу была-б ня ў сілах супраціўляцца штурмаву, які ідзіць-бы яе ў бок Масквы. Зацікнутыя ў іскох паміж Францыяй і Польшчай, мы прымушаны-б былі шукаць згоды з Крамлём, хоць-бы і добра ведалі, што прапаведуючы крыжовы паход сьвяроць так званых капіталістычных краін, яны не праводзяць аніякай розьніцы паміж Нямеччынай, Францыяй і Англіяй».

Польскі друк аб аўстра-нямецкай мытнай згодзе

ВАРШАВА, 24. Праект аўстра-нямецкай мытнай згоды прадпрымае заставацца ў цэнтры палітычнай увагі ўсяго польскага друку. Як урадавы, так і апазыцыйны друк адзінадушна ацэньваюць згоду, як палітычны крок нямецкага ўраду, накіраваны да ўзмацненьня палітычнай магутнасьці Нямеччыны, як першы крок на шляху далучэньня Аўстрыі да Нямеччыны, як палітычны ход, накіраваны супроць аграрных краін сярэдняй і паўднёва-усходняй Эўропы.

«Ілюстраваны кур'ер Цодзённы» лічыць, што Берлін цяпер здолее тэрарызаваць ўсе аграрныя дзяржавы. Газэта патрабуе абароны гаспадаркі і палітыкі Польшчы. З гэтай мэтай, паводле слоў газэты, неабходна ў адказ на аўстра-нямецкую згоду правесьці ў жыцьцё рашэньні варшаўскай аграрнай канфэрэнцыі, як вядома, завостраныя супроць СССР.

«Газэта Польска» спрабуе ўсімі сіламі паказаць, што савецка-нямецкае зьбліжэньне выгодна толькі Савецкаму саюзу. Газэта адкрыта абвінавачвае Нямеччыну ў тым, што сваёй палітыкай яна робіць нематчымую ізаляцыю СССР.

Францыа Марталь аб аграрнай канфэрэнцыі у Рыме

ПАРЫЖ. Вядомы фінансавы дзеяч сэнатар групы Пуанкарэ Францыа Марталь выступае ў «Аншоаліце» з артыкулам адносна будучай у Рыме аграрнай канфэрэнцыі. Аўтар падкрэсьлівае ўсю важнасьць гэтай канфэрэнцыі для будучай сусьветнай эканомікі з прычыны таго, што ў работах канфэрэнцыі прымуць удзел СССР і Канада, «два найбольш буйных вытворцаў хлеба».

«Рымская канфэрэнцыя, такім чынам, склікаецца ў час. Ёй трэба будзе перш на перш разгледзець пытаньне аб магчымасьці канфідэнтаваньня. Зусім зразумела,—заўважае Марталь,—што неабходна скараціць сусьветную пасеўную плошчу, а гэтага нельга дасягнуць інакш, як пры дапамозе згоды ў сусьветным маштабе. Калі ўсе 35 краін—удзельнікі канфэрэнцыі—дасягнуць згоды, калі асабліва Канада, ПАЗШ і СССР дасягнуць згоды, дык няшчасьце (г. зн. аграрны крызіс) можа быць затарможана».

Эміграцыя з Англіі ў калёніі скарачаецца

ЛЭНДАН, 17. У сувязі з сусьветным эканамічным крызісам вельмі скарацілася эміграцыя з Англіі ў калёніі і дамініёны. У 1930 годзе эміграваць усяго **92.158 чал.**, тады як у 1929 годзе лік эмігрантаў дасягнуў **143.686 чал.**

Украінскія папы на службе фашызму

ВАРШАВА, 23. Як-бы ў адказ на артыкул Галуўко аб магчымасьці польска-ўкраінскай згоды на аснове адмовы украінцаў ад жніх-бы та ні было прэтэнсій у межах Польшчы і з кампенсацыяй іх на Ўсходзе, апублікаваны лист Станіславаўскага епіскапа **Хамышына.**

«Мы стаялі і стаім сёньня на пазыцыях нацыяналістскай гарачкі,—піша Хамышын,—і маем таму поўны дзень вялікіх страты, даючы польскаму ўраду і грамадзянскі права ўжываць да ўкраінскага насельніцтва «палітыку рэпрэсій».

Спыняючыся на момантах так званага «сабатажу», епіскап, блізумоўна, зрабіў і рад апытаньняў вывадаў. Гаворачы аб лёяльнасьці ўкраінцаў да Польшчы, епіскап працягвае антысавецкія выпады, заўважючы: «Я йду далей і на выдзіўленьне палякаў, а можа і на абурэньне ўкраінцаў сьцьвярджаю, што наша лёяльнасьць павінна разьвівацца ў крупку таго, каб польская дзяржава была магутнай, моцнай і адначасова праўдзівай».

Створаная нядаўна ўкраінска-каталіцкая партыя павінна быць, на думцы епіскапа, такой арганізацыяй, якая будзе згуртоўваць людзей для работы «па рэалізацыі ўкраінска-польскага зьбліжэньня».

Украінска-каталіцкі саюз, які работае пад кіраўніцтвам вядомага мітрапаліта Шэпіцкага, выступае ў друку з **актыўным падтрыманьнем** листа Хамышына.

Блізкая да ўраду газэта **«Ілюстраваны Кур'ер Штодзённы»** з энтузіязмам вітае лист Хамышына і выказвае спадзяваньне, што ён дапаможа ажыць цяпер пакаданае зьбліжэньне.

Міжнародная хроніка

⊙ Лагорскія пакаранні сьмерцю (Індыя) выклікалі бурны рух пратэсту ва ўсёй Індыі. **У Бамбее, Калькуце і Сараці абвешчаны забастоўкі жалобы.** Усе магазыны, рынкі, фабрыкі і школы зачыны. Палажэньне вельмі напружанае. Узброеныя атрады паліцыі вартуюць на вуліцах галоўнейшых гарадоў.

⊙ Як паведамляюць з Бухарэста, нафтавая кампанія Дэтэрдынга «Роял Дэч Шэл» мае намер набыць усе належачыя дзяржаве акцыі румынскіх нафтавых кампаній, адначасова забясьпечыўшы Румынію пазыкай у 20 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

Зрыўшчыкаў мабілізацыі сродкаў —да судовай ад азнасьці

МАСКВА, 25. За сыстэматычнае ігнараваньне дырэктыў Калгасцэнтру і зрыў кантрольных заданьняў па мабілізацыі сродкаў, кіраўніцтва Калгасцэнтру рашыла прыцягнуць да судовай адказнасьці члена кіраўніцтва Крымскага абласнога калгассаюзу тав. Уладзімірава і члена кіраўніцтва ўсходнія-сібірскага облкалгассаюзу—тав. Воўкава.

За невыкананьне кантрольных заданьняў па мабілізацыі сродкаў прыцягваюцца таксама да суду т. т. Ярэменка (Ленінградзкі облкалгассаюз), Асмалоўскі (Калгасцэнтр Беларусі), Комешка (Масоблкалгассаюз) і рад адказных кіраўнікоў заходня-сібірскага краю і заходняй вобласьці калгассаюзаў.

...рабле...е жывёлагадоўлі—цэнтральнае месца ў сацсэктары

(З дакладу т. Стрэле аб жывёлагадоўлі)

Значную ўвагу Ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў надае пытаньню разьвіцьця жывёлагадоўлі. З вялікай увагай зьезд заслухоўвае даклад аб разьвіцьці жывёлагадоўлі ў сацсэктары БССР.

Дакладчык па гэтым пытаньні—намесьнік старшыні Белкалгасцэнтру тав. Стрэле,—падкрэсьліваючы буйныя посьпехі ў разьвіцьці жывёлагадоўлі, асабліва увагу зазначае на рэалізацыі пастаноў XVI партыйнага зьезду.

— У выніку напружанай работы,— гаворыць тав. Стрэле,—мы ўжо зараз маем поўныя дасягненьні ў разьвіцьці жывёлагадоўлі ў сацыялістычным сэктары. Паводле няпоўных зестак, за апошні квартал 1930 году, колькасьць буйнай рагатай жывёлы павялічалася на 2 проц. у параўнаньні з першым квартałам, а колькасьці сьвіней—на 20 проц. На 1 сакавіка 1931 г. мы ўжо маем 508 спэцыялізаваных малочна-жывёлагадоўчых калгасаў, у якіх пастаўлены 41.772 каровы; маем 1.742 сьвінагадоўчых калгасы, у якіх пастаўлена 35.000 сьвіноматак.

Шпаркі рост удзельнай вагі калгасаў у агульным статку жывёлагадоўлі стварае поўную магчымасьць для вырашэньня мясной праблемы шляхам арганізацыі буйных сацыялістычных жывёлагадоўчых калгасаў.

Далей тав. Стрэле спыняецца на радзе буйных недахопаў па ўкамплектаваньні гаспадарак жывёлай і сьвіноматкамі, асабліва спэцыялізаваных гаспадарак. Потым дакладчык асабліва ўвагу зазначае на пытаньнях кармавой праблемы.

— Надзвычай вузкім месцам у справе разьвіцьця жывёлагадоўлі зьяўляецца кармавое пытаньне. Зусім зразумела, што вялізарная праграма ў галіне жывёлагадоўлі патрабуе ўдарнасьці ў рабоце. Для таго, каб выканаць праграму жывёлагадоўлі, мы павінны асаблівую увагу зьвярнуць на стварэньне належнай кармавой базы. Кардавое пытаньне зьяўляецца вузлавым пытаньнем у нашых мерапрыемствах па жывёлагадоўлі. Ажыцьцяўленьне праграмы жывёлагадоўлі у значнай меры залежыць ад вырашэньня кармавога пытаньня. Без стварэньня належнай кармавой базы нельга вырашыць пытаньня жывёлагадоўлі. Вось чаму, рыхтуючыся да веснавой сяўбы, мы павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на стварэньне кармавой базы па жывёлагадоўчых калгасах.

Мы намячаем засеяць у калгасах ня менш 217 тыс. га бульбы, 32 тыс. га кармавых коранеплодаў, 20 тыс. га сілосных культур, 99 тыс. га аднагадовых траў і 119 тыс. га канюшыны. Выкананьне гэтай праграмы створыць хармавую базу для разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Асаблівую ўвагу ў сэнсе стварэньня кармавой базы сёлета мы павінны зьвярнуць на справу сіласаваньня. Паводле выначанага плану, мы павінны засіласаваць 502 тыс. тон зялёнай масы. Тыя досьледы, якія мы правялі ў радзе калгасаў, сьцьвярджаюць, што ня гледзячы на навізну сіласаваньня, гэта справа сябе апраўдала. Сілос вышаў добры. У першаяе справы сіласаваньня ўпэўнены ня толькі шырокія масы калгасьнікаў але і адзіласобнікі.

Асноўную масу сілосу ў 1931 г. мы будзем класьці ня ў вежы, а ў ямы і траншэі. Неабходна ўжо з самай раньняй вясны правесьці мерапрыемствы па падсушэньню сілосных траншэй, на выкапцы ям з тым, каб да 1 лініня гэтых сілосных установкі былі гатовы.

Асаблівую ўвагу ў сваім дакладзе тав. Стрэле надае пытаньню будаўніцтва ў калгасах.

У галіне будаўніцтва па сьвінагадоўлі намечана пабудаваць сьвінарнікаў на 125 тыс. сьвінамесц і адкормачнікаў на 196 тыс. месц. Кошт будаўнічай праграмы, складае каля 18 млн. руб. Гэта праграма патрабуе надзвычайна вялікай колькасьці будаўнічых матар'ялаў—дрэва, жалеза, цьвікоў і інш. матар'ялаў. На справу будаўніцтва трэба мабілізаваць усе мясцовыя рэсурсы. Нажаль, на сёньняшні дзень у радзе калгасаў маюцца надзеі на тое, што для будаўніцтва сьвінарнікаў і скотнікаў увесь будаўнічы матар'ял будзе дастаўлены самацёкам. Асноўны цэнтр увагі ў сэнсе падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону павінен быць сканцэнтраваны на максымальным скарыстаньні мясцовых будаўнічых матар'ялаў.

Асаблівa буйныя мерапрыемствы ў галіне жывёлагадоўлі мы павінны праводзіць у пытаньнях арганізацыі працы. З арганізацыяй працы ў жывёлагадоўчых гаспадарках справа абстаіць дрэнна. Да апошняга часу рад калгасаў яшчэ не ўяўлі сабе такога простага мерапрыемства як стварэньне сталых брыгад для догляду за жывёлай; жывёла даглядзецца ў парадку чарэ. Нормы выпрацоўкі, зьдзельшчына—зьмаль ня ўжываюцца. Больш таго, маюцца нават такія настрої, што зьдзельнічыну і нормы выпрацоўкі нібыта мы ўжываць ня можам. Гэта недапушчальныя факты, з імі трэба змагацца.

Трэба дабіцца, каб кожны калгасьнік, кожная калгасьніца добра зразумелі, што дагляд за сьвінямі не зьяўляецца самай горшай работай, а самай пачэснай работай, бо вырае сьвінагадоўля зьяўляецца асноўным сродкам вырашэньня мясной праблемы. Той, хто добра працуе ў гэтай галіне, той дапамагае савецкай уладзе вырашаць мясную праблему, той зьяўляецца актыўным удзельнікам у вырашэньні гэтай важнейшай задачы.

Пытаньне падвышэньня таварнасьці ў жывёлагадоўлі калгасаў набывае выключнае значэньне. Усе нашы мера прыемствы ў галіне жывёлагадоўлі мы павінны падпарадкаваць асноўнай мэце—стварэньню найвышэйшай таварнасьці.

Адзіным верным шляхам для стварэньня таварнасьці ў калгасах зьяўляецца будаўніцтва буйных спэцыялізаваных малочна - жывёлагадоўчых і сьвінагадоўча-таварных фэрм, якія ёсьць на дагаворных пачатках і якія камплектуюцца выключна таварнай жывёлай. Зараз у нас створаны два цэнтры: малочны і сьвінагадоўчы. Гэтыя цэнтры павінны абъядноць усе малочныя таварныя фэрмы і ўсе сьвінаводчыя фэрмы, заключыць з імі дагаворы. Гэтыя мерапрыемствы маюць вялікае значэньне, яны павялічаць таварнасьць калгасаў. На стварэньне фэрм, на правядзеньне дагаворнай кампаніі павінна быць зьвернута асаблівая ўвага.

Нарэшце пытаньне гадоўлі коняй і конскай цягавай сілы. Ня гледзячы на ўкараненьне трактараў у с.-гаспадарку, конская цягавая сіла яшчэ доўга будзе займаць вялікае месца ў нашай гаспадарцы. Таму мы павінны ўсімі мерамі разьвіваць каняводзтво, клапаціцца аб цягавай сіле. Зараз-жа ў радзе калгасаў **недацэньваюць значэньня каня.** Як толькі ў раёне зьяўляецца машына-трактарная станцыя—кожны старшыня калгасу лічыць непатрэбным прадаць каня. У выніку мы зараз маем такое становішча, калі на аднаго каня ў калгасе прыпадае 9,6 гэкт. пахані. Гэта нагрузка надзвычай вялікая. Мы лічым, што нармальная нагрузка зьяўляецца 6 гэкт.

Калгасы павінны не паслабляць увагі цягавай сіле. А ад яе ў значнай ступені залежыць пасьляховае правядзеньне другой калгаснай вясны.

— Толькі бальшавіцкімі тэмпамі работы і шырокім уздымам актыўнасьці ўсіх калгасных мас, можна забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну жывёлагадоўлі.

НАША КАНСУЛЬТАЦЫЯ ДА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ

АСУШВАЙЦЕ і ПАЛЯПШАЙЦЕ ПАШУ

1. Вільготную пашу трэба перш за ўсё асушыць! На вільготнай пашы і жыцёла больш хварэе (асабліва крывамочнай) і трава на такой пашы расьце ще дрэнная. Параўнайце сухую, дрыве дзеную ў парадзе пашу і вільготную, забалочаную: на сухой растуць мурожвай трава, шмат чырвонай і рурожвай, і асабліва — белай канюшыны. На мокрай — больш ўсяго кіслых траў, асок, вейнікаў, пушыцы, хвошчы. На такіх пашах ня мала ёсьць і атрупных траў.

2. Калі паша мае схіл і ясна відаць, куды можна спусьціць лішнюю ваду,— асушвайце пашу сваімі сіламі. Але калі паша вельмі вялікая і цяжка вывіць, як трэба рыць каналы, каб спусьціць ваду, — лепш параіцца са спэцыялістам і правесьці гэту работу на яго ўказаньні. Ва ўсякім выпадку пры ступаць да работы трэба толькі параўшыся з агрономам. Часамі нават адна толькі асушка пашы многа дапамагае справе рост траўы павялічваецца, кіслыя травы зьнішчаюцца і замест іх вырастае мурог і канюшына.

3. Калі на пашы ёсьць старыя каналы,—іх трэба неадкладна аднавіць, ачысьціць. Зямлю і ціну са дна каналу або раскідаць тут-жа па пашы, або, лепш, склясьці ў кучы, даць вадзе зьбегчы з кучы направіць, і калі дзярнина перагніе, скарыстаць яе на ўгнаеньне.

4. Пашу выгадней асушваць не адкрытымі каналамі, а закрытымі, дранажам. Каналы займаюць шмат месца. Бераці каналу жывёла заўсёды абсыпае і адкрытыя каналы штогод прыходзіца аднаўляць, а часам сярод лета прыходзіцца рабіць шмат мастоў. Адным словам, адкрытыя каналы патрабуюць увесь час догляду. Дранажныя каналы ў першы год капітуюць трохі даражэй адкрытых, але ўжо праз 2-3 гады выдатак гэты пакрываецца, дзякуючы вытадзе такога спосабу асушкі.

5. Дранажныя каналы лёгка пабудаваць з матар'ялаў, якія знаходзяцца пад рукамі. На дно каналу можна класьці буйныя каменьні, жэрдкі, кавалкі ці зьв

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗАЦЬВЕРДЖАНЬНЕ ПАЛАЖЭНЬНЯ ПРА РАЁННЫЯ ЗЬЕЗДЫ САВЕТАЎ І РАЁННЫЯ ВЫКАНАЎЧЫЯ КАМІТЭТЫ.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

I. Зацьвердзіць новае палажэньне пра раённыя зьезды саветаў і раённыя выканаўчыя камітэты.

II. Скасаваць наступныя пастановы:

1. Аб увядзеньні ў дзейнасьць новага палажэньня аб раённых зьездах саветаў, іх выканаўчых камітэтах і сельскіх саветаў (З. З. БССР 1925 г., № 31, арт. 289).

2. Палажэньне аб раённых зьездах саветаў і іх выканаўчых камітэтах (З. З. БССР 1925 г. № 31 арт. 290 і 1927 г. № 6, арт. 25).

3. Аб правах раённых выканаўчых камітэтаў прымаць на сябе абавязанасьці і ўваходзіць у гаспадарчыя дагавораны адносіны (З. З. БССР 1926 г., № 9, арт. 39).

4. Пра склад акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў і іх прэзыдыумаў (З. З. БССР 1929 г., № 8, арт. 34).

5. Арт. 1-шы пастановы «аб зацьвердженьні палажэньня аб раённых рэвізійных камісіях і рэвізійных камісіях пры сельскіх і местачковых саветах» (З. З. БССР 1929 г. г., № 6, арт. 20).

6. У пастанове «пра пашырэньне праў раённых рэвізійных камісій пры сельскіх і местачковых саветах» (З. З. БССР 1928 г. №32, арт. 299) ва ўступнай частцы словы: «і раённых выканаўчых камітэтаў» у арт. 1-м словы «надаць права раённым рэвізійным камісіям правяраць выкананьне раённымі выканаўчымі камітэтамі пастановаў раённага зьезду саветаў і», скасаваць.

7. Аб увядзеньні ў дзейнасьць палажэньняў пра акруговыя і раённыя зьезды саветаў, іх выканаўчыя камітэты і пра сельскія саветы. (З. З. БССР 1924 г., № 13, арт. 113).

8 Палажэньне пра акруговыя зьезды саветаў і іх выканаўчыя камітэты (З. З. БССР 1924 г., № 13, арт. 114; 1925 г., № 9 арт. 76 і 1927 г. № 10, арт. 32).

9. Пра мясцовыя органы Народнага Камісарыяту Гандлю БССР (З. З. БССР 1924 год, № 21, арт. 186).

10. Пра зацьвердженьне палажэньня пра акруговыя аддзелы камунальнай гаспадаркі (З. З. БССР 1925 г., № 21, арт. 192).

11. Пра зацьвердженьне палажэньня пра сакратарыяты акруговых выканаўчых камітэтаў (З. З. БССР 1925 г., № 21, арт. 193).

12. Аб падцьвердженьні палажэньня аб аддзелах сацыяльнай забясьпекі акруговых выканаўчых камітэтаў (З. З. БССР 1925 г., № 30, арт. 285).

13. Палажэньне аб акружных плянавых камісіях (З. З. БССР 1925 г., № 34, арт. 310).

14. Палажэньне аб плянавых камісіях пры акруговых выканаўчых камітэтах БССР (З. З. БССР 1926 г., № 50, арт. 188).

15. Палажэньне аб інспэкцыях мясцовай прамысловасьці акруговых выканаўчых камітэтаў (З. З. БССР 1927 г. № 43, арт. 229 і 1928 г. № 16, арт. 143).

16. Пра арганізацыю аддзелаў работа-сялянскіх інспэкцый акруговых выканаўчых камітэтаў (З. З. БССР 1929 г., № 9, пас. 48).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

15 лютага 1931 г.
г. Менск.

Палажэньне

пра раённыя зьезды саветаў і раённыя выканаўчыя камітэты

РАЗЬДЗЕЛ I.

Раённыя зьезды саветаў

А. Арганізацыя раённых зьездаў саветаў

1. Раённыя зьезды саветаў складаюцца з прадстаўнікоў усіх сельскіх і местачковых саветаў раёну з разьліку адзін дэлегат на 500 жыхароў, а таксама з прадстаўнікоў гарадзкіх саветаў, падпарадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту, фабрык і заводаў, якія знаходзяцца не ў гарадох, і савецкіх гаспадарак — з разьліку адзін дэлегат на 100 выбаршчыкаў.

Гэтыя нормы прадстаўніцтва ў адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі могуць зьмяняцца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

2. Раённыя зьезды саветаў бываюць чарговыя і надзвычайныя. Чарговыя раённыя зьезды саветаў склікаюцца раённымі выканаўчымі камітэтамі ў тэрміны якія вызначаюцца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Надзвычайныя раённыя зьезды саветаў склікаюцца: а) па прапанове Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, б) па ініцыятыве раённага выканаўчага камітэту, в) па патрабаваньні аднэй траціны агульнага ліку саветаў (сельскіх, местачковых, гарадзкіх), фабрык, заводаў і савецкіх гаспадарак якія пасылаюць сваіх прадстаўнікоў на раённы зьезд саветаў.

3. Аб дні раённага зьезду саветаў і аб пытаньнях, пастаўленых на вырашэньне зьезду, прэзыдыумы раённых выканаўчых камітэтаў сваячасова, не пазьней як за 10 дзён, абвяшчаюць усім саветам, фабрыкам, заводам і савецкім гаспадаркам.

4. Раённыя зьезды саветаў выбіраюць прэзыдыумы зьездаў для кіраваньня работамі зьездаў і мандатныя камісіі для праверкі паўнамоцтваў дэлегатаў. Да выбару прэзыдыуму зьезду работамі зьезду кіруе прэзыдыум раённага выканаўчага камітэту.

У склад прэзыдыумаў раённых зьездаў саветаў могуць выбірацца і тыя асобы, якія не зьяўляюцца дэлегатамі зьездаў, незалежна ад месца іх пражываньня і работы.

5. Усе пасяджэньні раённых зьездаў саветаў павінны быць адкрытымі і на іх могуць прысутнічаць шырокія колы працоўных.

6. Усе пытаньні на раённых зьездах саветаў вырашаюцца адкрытым галасаваньнем і большасьцю галасоў дэлегатаў, якія прысутнічаюць на зьездах.

7. Абавязкі дэлегатаў раённых зьездаў саветаў выконваюцца бясплатна. Утрыманьне дэлегатаў раённых зьездаў саветаў у час зьезду, і дарожныя выдаткі дэлегатаў зьездаў аплачваюцца ў парадку, вызначаным спэцыяльным законам.

Б. Кампэтэнцыя раённых зьездаў саветаў

8. Раённы зьезд саветаў ёсьць вышэйшы орган улады на тэрыторыі раёну, які яднае ўсё працоўнае насельніцтва раёну для ўдзелу ў дзяржаўным кіраваньні і савецкім будаўніцтве.

9. У кампэтэнцыю раённага зьезду саветаў уваходзіць:

а) зацьвердженьне, у адпаведнасьці з дырэктывамі вышэйшых органаў улады, гаспадарчых і сацыяльна-культурных плянаў раёну, раённага бюджэту і раённага зводу мясцовых бюджэтаў, а таксама разгляд справаздачаў аб выкананьні гэтых плянаў і бюджэтаў;

б) устанаўленьне, у адпаведнасьці з чынным заканадаўствам, мясцовых падаткаў, зацьвердженьне разьмеркаваньня даходаў і выдаткаў паміж раённымі, гарадзкімі, сельскімі і местачковымі бюджэтамі, а таксама разьмеркаваньне маемасьці на маемасьць раённага, гарадзкога, сельскаага і местачковага значэньня;

в) разгляд і абмеркаваньне справаздач аб дзейнасьці дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў, каапэрацыйных і іншых грамадзкіх арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёну;

г) разгляд і абмеркаваньне справаздач аб рабоце раённага выканаўчага камітэту;

д) абмеркаваньне пытаньняў агульнасаюзнага і рэспубліканскага значэньня;

е) вырашэньне іншых пытаньняў мясцовага значэньня і дача раённаму выканаўчаму камітэту кіруючых паказаньняў і заданьняў;

ж) выбары раённых выканаўчых камітэтаў;

з) выбары дэлегатаў ад раённых зьездаў саветаў на Ўсебеларускі Зьезд Саветаў;

10. Пастановы раённага зьезду саветаў могуць быць скасаваны, зьмешаны або прыпынены Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам БССР альбо яго Прэзыдыумам.

РАЗЬДЗЕЛ II.

Раённыя выканаўчыя камітэты

А. Агульныя палажэньні

11. Вышэйшым органам савецкай улады на тэрыторыі раёну ў перыяд паміж раённымі зьездамі саветаў зьяўляецца раённы выканаўчы камітэт.

12. Раённы выканаўчы камітэт выбіраецца раённым зьездам саветаў у ліку 30 членаў і 10 кандыдатаў да іх. Лік членаў і кандыдатаў для паасобных больш буйных раёнаў можа зьмяняцца на пастанове Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

13. Чарговыя пасяджэньні раённага выканаўчага камітэту склікаюцца яго прэзыдыумам у раённым цэнтры або ў іншых населіўчых раёну ня менш аднаго разу ў 2 месяцы.

Надзвычайныя пасяджэньні раённага выканаўчага камітэту склікаюцца яго прэзыдыумам па сваёй ініцыятыве або на прапанове двох трацін агульнага ліку членаў раённага выканаўчага камітэту, а таксама па прапанове Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту або Савету Народных Камісараў БССР.

14. Пасяджэньні раённага выканаўчага камітэту павінны быць адкрытымі.

15. На пасяджэньнях раённага выканаўчага камітэту права пастаноўчага голасу маюць толькі члены раённага выканаўчага камітэту і кандыдаты ў члены, калі яны замяняюць членаў раённага выканаўчага камітэту.

З правам дарадчага голасу на пасяджэньнях раённага выканаўчага камітэту павінны ўдзельнічаць кандыдаты ў члены раённага выканаўчага камітэту і могуць удзельнічаць прадстаўнікі сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў раёну, загадчыкі аддзелаў, інспэктары і інструктары раённага выканаўчага камітэту; прадстаўнікі пракуратуры і суда, прадстаўнікі народных камісарыятаў, члены Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і БССР, члены і кандыдаты ў члены ЦВК Саюзу і ЦВК БССР, а таксама іншыя асобы якія запрашаюцца раённымі выканаўчымі камітэтамі альбо іх прэзыдыумамі.

16. Для абмеркаваньня больш важных пытаньняў мясцовага альбо агульнадзяржаўнага значэньня пасяджэньні раённага выканаўчага камітэту па яго пастанове або па пастанове яго прэзыдыуму могуць быць пашыраны праз запрашэньне на іх прадстаўнікоў прафэсыйных і іншых грамадзкіх арганізацый, прадстаўнікоў рабочых фабрык, заводаў, і савецкіх гаспадарак, прадстаўнікоў калгасаў раёну, прадстаўнікоў мясцовых вайсковых частак прадстаўнікоў усіх сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў раёну, навуковых работнікаў раёну і іншых асоб.

17. Для ажыцьцяўленьня сваіх пастаноў і пастаноў і загадаў вышэйшых органаў улады і для кіраваньня і яднаньня дзейнасьці ўсіх падпарадкаваных яму органаў, раённы выканаўчы камітэт выбірае з свайго складу прэзыдыум з 11 асоб (старшыня, намесьнік старшыні, сакратар і 8 членаў) і 3-х кандыдатаў да іх.

18. У перыяд паміж пасяджэньнямі раённага выканаўчага камітэту яго прэзыдыум мае ўсе правы раённага выканаўчага камітэту і дае раённаму выканаўчаму камітэту ня менш двох разоў у год справаздачы аб сваёй дзейнасьці.

19. Пасяджэньні прэзыдыуму раённага выканаўчага камітэту склікаюцца ня менш аднаго разу ў дзесяць дзён.

20. У неадкладных выпадках старшыня раённага выканаўчага камітэту мае права даваць распараджэньні і ўжываць патрэбныя захады, якія ўваходзяць у кампэтэнцыю прэзыдыуму раённага выканаўчага камітэту, з наступным паведамленьнем аб сваіх распараджэньнях і ўжытых захадах прэзыдыуму раённага выканаўчага камітэту на бліжэйшым пасяджэньні.

21. Раённы выканаўчы камітэт мае правы юрыдычнай асобы.

Б. Асноўныя задачы раённых выканаўчых камітэтаў

22. На раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаюцца наступныя асноўныя задачы:

а) нагляд за ажыцьцяўленьнем рэвалюцыйнай законнасьці, ажыцьцяўленьне законаў і загадаў савецкай улады і растлумачэньне іх насельніцтву; кантроль у межах раёну за выкананьнем законаў усімі органамі, арганізацыямі і грамадзянамі; падаўленьне ўсякага супроцьдзеяньня законам і мерапрыемствам савецкай улады; змаганьне з скрыўленьнямі клясавай лініі пры ўжываньні законаў і ва ўсёй практычнай рабоце савецкіх органаў, каапэрацыйных і іншых грамадзкіх арганізацый; абмеркаваньне пытаньняў агульнасаюзнага і рэспубліканскага значэньня і ўнясеньне ў вышэйшыя органы заканадаўчых прапаноў, абгрунтаваных на мясцовых практыцы і ініцыятыве;

б) арганізацыя рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднаты і серадняцкага сялянства для выкананьня плану індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі на аснове калектывізацыі, каапэраваньня і будаўніцтва савецкіх гаспадарак;

в) няўхільнае правядзеньне палітыкі наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі і ліквідацыя кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі;

г) залучэньне працоўных мас у беспасрэднае дзяржаўнае кіраўніцтва; вылучэньне ў савецкі апарат рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднаты і сераднякоў; шырокае разгортваньне самакрытыкі, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва; рашучае змаганьне з бюракратызмам, цяганіною і безгаспадарчасьцю; арганізацыя шырокага грамадзкага кантролю за работаю ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і каапэрацыі ў межах раёну;

д) ажыцьцяўленьне культурнай рэвалюцыі праз правядзеньне ўсеагульнага пачатковага навучаньня, ліквідацыі непісьменнасьці і іншых мерапрыемстваў, накіраваных да падвышэньня палітычнага і культурнага ўзроўню мас; стварэньне умоў для перабудаваньня быту працоўных на сацыялістычных падставах;

е) ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі савецкай улады, ужываньне за хадаў да падвышэньня палітычнага, эканамічнага і культурнага ўзроўню ўсіх нацыянальнасьцяй і залучэньне іх у савецкае будаўніцтва;

ж) дапамога будаўніцтву Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і арганізацыя сіл і сродкаў раёну для падвышэньня абароназдольнасьці Саюзу ССР.

23. Раённыя выканаўчыя камітэты, ажыцьцяўляючы паказаньні ў арт. 22 задачы, кіруюць дзейнасьцю ўсіх раённых устаноў, сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў раёну, а таксама ажыцьцяўляюць агульны нагляд і кантроль за дзейнасьцю ўстаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёну і не падпарадкаваны яго органам, і дапамагаюць ім у іх рабоце.

Ажыцьцяўляючы кантроль і рэвізію, раённыя выканаўчыя камітэты не павінны ўмешвацца ў апэрацыйную дзейнасьць устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый. Аб няправільнасьцях і недахопах у рабоце ўстаноў і арганізацый, якія не падпарадкаваны раённаму выканаўчаму камітэту, апошні паведамляе адпаведным вышэйшым органам і арганізацыям.

В. Кампэтэнцыя раённых выканаўчых камітэтаў

24. У паасобных галінах кіраўніцтва раённыя выканаўчыя камітэты маюць наступныя правы і абавязкі:

У ГАЛІНЕ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ.

25. У галіне арганізацыйнай на раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаецца:

а) арганізацыя раённых выбарчых камісій, назначэньне старшынь сельскіх местачковых і гарадзкіх выбарчых камісій і кіраваньне дзейнасьцю гэтых камісій;

б) вызначэньне тэрмінаў правядзеньня выбараў у сельскія, местачковыя і гарадзкія саветы раёну ў межах тэрмінаў, вызначаных Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР;

в) ажыцьцяўленьне нагляду за законнасьцю правядзеньня выбараў саветаў у раёне, скасаваньне выбараў паасобных саветаў і назначэньне новых выбараў саветаў, падпарадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту, у выпадках, прадугледжаных выбарчым заканадаўствам, а таксама арганізацыя ў гэтых выпадках новых выбарчых камісій;

г) датэрміновы роспуск і назначэньне новых датэрміновых выбараў сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў у раёне ў выпадках поўнай бязьдзейнасьці, скрыўленьня клясавай пралетарскай лініі, слабага кіраваньня сацыялістычным будаўніцтвам, слабай работы па арганізацыі батрацтва і беднаты і па іншых падобных прычынах;

д) зацьвердженьне ў сельскіх мясцовасьцях сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права і разгляд скаргаў на пазбаўленьне выбарчага права;

е) кіраваньне дзейнасьцю сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў раёну, а таксама дзейнасьцю іншых, падпарадкаваных раённым выканаўчым камітэтам, органаў улады, устаноў, прадпрыемстваў і службовых асоб;

ж) правядзеньне практычных мерапрыемстваў для залучэньня рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднаты і сераднякоў у работу саветаў;

з) вывучэньне дзейнасьці нізавога савецкага апарату з мэтаю яго ўмацаваньня і арганізацыя мерапрыемстваў для падрыхтоўкі і падвышэньня кваліфікацыі работнікаў нізавога савецкага апарату, скліканьне зьездаў і нарад мясцовых работнікаў;

і) распрацоўка па сваёй ініцыятыве праектаў і прапаноў аб зьмене чыннага заканадаўства і падача іх на разгляд заканадаўчых органаў, а таксама дача заключэньняў па тых праектах, якія накроўваюцца з гэтаю мэтаю заканадаўчымі органамі;

к) падача на папярэдняе абмеркаваньне саветаў праектаў мерапрыемстваў раённага значэньня;

л) агульнае кіраваньне дзейнасьцю сельскіх рэвізійных камісій і вырашэньне разнагалосьсяў паміж рэвізійнымі камісіямі і саветамі;

м) разьмеркаваньне абавязкаў паміж членамі раённага выканаўчага камітэту;

н) вырашэньне пытаньняў аб арганізацыі новых сельскіх саветаў, аб далучэньні да сельскіх саветаў новых паселішчаў, аб перанясеньні цэнтраў сельскіх саветаў і падача сваіх пастаноў аб гэтым на зацьвердженьне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

У ГАЛІНЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ.

26. У галіне адміністрацыйнай на раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаецца:

а) папярэджваньне і змаганьне з контр-рэвалюцыйнымі выступленьнямі і іншымі злачынствамі, якія накіраваны супроць савецкага ладу, з ужываньнем, у патрэбных выпадках, вайсковай сілы, паводле чыннага заканадаўства; ужываньне захадаў да папярэджваньня і спыненьня ўсялякіх злачынстваў на тэрыторыі раёну, да зьнішчэньня розных прытулкаў злачыннага элемэнту і азартных гульняў;

б) узьняцьцё пытаньняў аб увядзеньні надзвычайных мер аховы рэвалюцыйнага парадку ў раёне і аб зьняцьці гэтых мер;

в) выданьне абавязковых пастаноў з устанаўленьнем за іх парушэньне адказнасьці ў адміністрацыйным або судовым парадку, прычым у адміністрацыйным парадку раённы выканаўчы камітэт можа назначаць штраф да 100 руб. або прымусовыя работы да 15 дзён;

г) накладваньне дысцыплінарных пакараньняў, паводле чыннага заканадаўства, на раённых, сельскіх, местачковых і гарадзкіх работнікаў;

д) зьняцьцё або зьмяншэньне з прычыны беднасьці карнявога кошту самавольна сьсечанага лесу, калі справа аб парубцы была разгледжана адміністрацыйным парадкам;

е) скасаваньне, зьмена або прыпыненьне пастаноў усіх нижэйшых саветаў, а таксама органаў, падпарадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту;

ж) нагляд за выкананьнем правілаў аб ахове грамадзкай бясьпекі і папярэджаньне няшчасных выпадкаў;

з) нагляд за ўсімі відамі гандлю; выдача дазволу на гандаль сьпіртусовымі напіткамі, паляўнічай зброяй і прыпасамі да яе, а таксама фатаграфічнымі апаратамі;

і) выдача дазволаў на захаваньне і карыстаньне паляўнічай агнястрэльнай нарэзнай і ненарэзнай зброі, а так сама мелкакалібарных спартыўных вінтовак і агняпрыпасаў да іх, паводле чыннага заканадаўства; нагляд за выкананьнем правілаў паляваньня і рыбнай лоўлі;

к) ужываньне захадаў для папярэджваньня навальных бядот (лясных пажараў, разводзьдзяў, масавых шкоднікаў і г. д.) і змаганьне з імі;

л) прыцягненьне насельніцтва да працоўнай і гужавой павіннасьці ў выпадках, прадугледжаных чынным заканадаўствам;

м) ахова чыгунак і водных шляхоў, тэлеграфнай і тэлефоннай сеткі, радыёўстановак, электра-праводнай сеткі; дапамога ў ажыцьцяўленьні паштовых апэрацый і ў сваячасовай дастаўцы пошты на тэрыторыі раёну;

н) нагляд за рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану сельскімі, местачковымі і гарадзкімі саветамі; дача дазволу на браньне шлюбу асобамі, якім няма 18 гадоў, загадваньне архівам запісаў актаў грамадзянскага стану;

о) ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў для выканаьня дырэктыў аб адлучэньні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы і дапамога антырэлігійнай прапагандзе, вядзеньне падліку рэлігійных аб'яднаньняў, заключэньне дагавораў аб перадачы ў карыстаньне веруючых царкоўных будынкаў і культурнай маемасьці і нагляд за выкананьнем гэтых дагавораў;

п) выдача дазволу на рэлігійныя працэсіі, якія наладжваюцца ў межах раёну на тэрыторыі некалькіх саветаў або забарона гэтых працэсій па санітарных і іншых прычынах, пры гэтым хадайніцтва аб дазволе працэсій падаюцца ў раённы выканаўчы камітэт праз сельскія і местачковыя саветы не пазьней як за 5 дзён да дня працэсіі;

р) зацьвердженьне статутаў і рэгістрацыя таварыстваў, якія ня маюць на мэце атрыманьня прыбытку, калі іх дзейнасьць ня выходзіць за межы раёну; рэгістрацыя мясцовых аддзяленьняў рэспубліканскіх і агульнасаюзных і іншых таварыстваў, якія маюць на мэце атрыманьня прыбытку і нагляд за іх дзейнасьцю;

с) дача дазволу на скліканьне раённых зьездаў, канфэрэнцый і нарад;

т) нагляд за распаўсюджваньнем друкаваных твораў і за гандлем імі;

у) прыманьне ў грамадзянства Беларускай ССР чужаземных працоўных грамадзян у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам;

ф) канчатковае зацьвердженьне жаў мястэчак і гарадоў, падпарадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту;

х) атульнае кіраваньне правядзеньнем папраўна-працоўнай палітыкі ў межах раёнаў, нагляд за месцамі зьмяленьня, арганізацыя прымусовых работ у раёне;

ц) змаганьне, ва ўстаноўленым законам парадку, з кабальнымі дагаворамі і кіраваньне ў гэтай справе дзейнасьцю сельскіх і местачковых саветаў;

ч) зацьвердженьне сьпісаў асоб, якія павінны быць залічаны ў тылавое ахоўнае;

ш) выдача дазволаў на выраб пратак з дзяржаўным гербам.

У ГАЛІНЕ ПЛЯНАВА-СТАТЫСТЫЧНАЙ РАБОТЫ.

27. У галіне плянава-статыстычнай работы на раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаецца:

а) распрацоўка, на падставе дырэктыў вышэйшых органаў улады, плянаў разьвіцьця сельскай гаспадаркі на шляху калектывізацыі, прамысловасьці, дарожнага будаўніцтва і іншых галін гаспадаркі і сацыяльна-культурнага будаўніцтва раёну і падача гэтых плянаў у адпаведныя рэспубліканскія ўстановы;

б) дача падпарадкаваным сельскім местачковым і гарадзкім саветам кантрольных лічбаў і дырэктыў па складаньні іх гаспадарчых плянаў; разгляд і зацьвердженьне гэтых плянаў;

в) разгляд плянаў бюджэтнага фінансаваньня і бажаўскага крэдытаваньня галін гаспадаркі, падпарадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту;

г) нагляд за ажыцьцяўленьнем плянаў разьвіцьця народнай гаспадаркі, сацыяльна-культурнага будаўніцтва і г. д.;

д) распрацоўка і зацьвердженьне плянаў і мерапрыемстваў па дасьледаваньні вытворчых сіл і вывучэньні народнай гаспадаркі раёну;

е) разгляд плянаў устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый агульнасаюзнага і рэспубліканскага значэньня і частцы іх дзейнасьці ў межах раёна, дача заключэньняў па гэтых плянах, аказаньне дапамогі ў іх выкананьні;

(Працяг будзе).

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

ПРА ВЫВУЧЭНЬНЕ І ПРА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ ПАСТАНОЎ X-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА І VI-ГА ЎСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

Пастановы X-га Усебеларускага і VI-га Ўсесаюзнага Зьезду Саветаў маюць вялізарнае палітычнае і практычнае значэньне, як важнейшыя ўстаноўкі ў справе далейшага разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, выкананьня задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі і ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкай краіны.

У мэтах шырокай папулярызацыі пастаноў VI-га Усесаюзнага і X-га Усебеларускага Зьезду Саветаў, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Выдаць пастановы X-га Усебеларускага і VI-га Усесаюзнага Зьезду Саветаў на беларускай, яўрэйскай, расійскай і польскай мовах і забясьпечыць імі ўсе саветы, установы, арганізацыі, саўгасы, калгасы і г. д.

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і саветам паставіць на пашыраных пленумах справаздачныя даклады аб выніках X-га Усебеларускага і VI Усесаюзнага Зьездаў Саветаў.

3. Перанесьці вывучэньне і шырокую папулярызацыю сярод працоўных мас пастаноў Зьездаў Саветаў на фабрыкі, у саўгасы, калгасы, на агульныя бядняцка-серадняцкія сходы, склікаючы для гэтага спэцыяльныя сходы з дакладамі аб пастановах Зьездаў Саветаў і ўвязваючы папулярызацыю пастаноў з работай па правядзеньні чарговых кампаній, выкананьнем прамфінпляну, разгортваньнем калектывізацыі і г. д.

4. Прапанаваць усім цэнтральным установам і арганізацыям, раённым выканаўчым камітэтам і саветам неадкладна ўключыць у свае пляны работы выкананьне дырэктыў Зьездаў Саветаў і сачыць за ходам выкананьня дырэктыў Зьездаў Саветаў па іх асобных вучастках работы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

25 сакавіка 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Пра аслабаненьне тав. Стракоўскага Ул. К. ад абавязкаў Намесьніка Старшыні Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанаўляе:

У зьвязку з пераходам тав. Стракоўскага Уладзіера Канстанцінавіча на іншую работу, аслабаніць яго ад абавязкаў Намесьніка Старшыні Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

25 сакавіка 1931 г.
г. Менск.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр — Сёньня адкрыты спэктакль. **1-я КОННАЯ** Пачатак а 8 гадз. увечары.

З ПАНЯДЗЕЛКА 23-га САКАВІКА

„Чырвоная Зорка" — 2 БУЛЬДЗІ 2. Звыш праграмы СУД ІДЗЕ (о рава ЦК РСДРП (меншавікоў). Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура" — Замежны фільм ПОРЫ. Звыш праграмы СУД ІДЗЕ (справа ЦК РСДРП меншавікоў) Пач. а 7, 8,45 і 10,30 Каса адч. з 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Замежны фільм. СКРЫПАЧ з ФЛОРЭНЦЫІ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — Новы савецкі фільм РАЗВОД Хроніка Саюзкіно № 8. Пач. 1 сэансу а 6 гадз. К са адч. з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр" — Мастацкі фільм. ЗАКОН ГОР. Драма ў 8 частках. Пачат. сэансу а 1 г. Каса адч. з 12 гадз.

Згодна пастановы праўленьня Белдзяржвыдавецтва **Аддзел падпіскі БДВ ЛІКВІДУЕЦЦА.** Усе арганізацыі, якія маюць якія-небудзь пратэнзіі, або разьлікі з гэтым аддзелам павінны падаць заявы **НЕ ПАЗЬНЕЙ 10-га КРАСАВІКА.** ПАСЬЛЯ ПАКАЗАНАГА ТЭРМІНУ НІЯКІЯ ПРАТЭНЗІІ ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ. Упаўнаваж. праўленьня БДВ па ліквідацыі ГУРЭВІЧ.

Аршанскаму Тэкстыльнаму Тэхнікуму патрэбны з 1-IV-31 г. **ВЫКЛАДЧЫКІ:**

Матэматыкі аклад	250 р.
Графікі „	230 р.
Тэхн. валакна „	350 р.

Жадаючыя заняць гэтыя пасады падаюць заявы і дакуманты на імя Тэкстыльнага Тэхнікуму да 28-III-31 г. Нам. Дырэктара Аляксейчык.

ПАСТАНОВА № 5

Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

г. Менск — 23 сакавіка 1931 г.

На падставе пастановы СНК СССР ад 28-II-1931 г. і пастановы СНК БССР ад 3-III-1931 г. («Савецкая Беларусь» № 55 (3144—1931 г.) пра перарэгістрацыю гарадзкога насельніцтва ў сувязі з выдачай адзінай наборнай кніжкі, Прэзыдыум Менскага Гарадзкога Савету **пастанаўляе:**

1. Перарэгістрацыю насельніцтва гораду Менску правесьці з 25 сакавіка па 31 сакавіка 1931 г.

2. Перарэгістрацыя вытвараецца шляхам абходу рэгістратарамі МЦРК дамаўладаньняў і кватэр.

Арганізацыйна-мэтадалёгічнае кіраўніцтва гэтай перарэгістрацыі ўскладаецца на плянавую камісію Менгарсавету.

3. Перарэгістрацыі падлягае ўсё насельніцтва г. Менску незалежна ад права на атрыманьне наборнай кніжкі а таксама і тое насельніцтва, якое пражывае за межамі гораду Менску, шляхам абходу рэгістратарамі МЦРК.

УВАГА: Перарэгістрацыя забясьпечванага насельніцтва, якое пражывае за межамі тэрыторыі гор. Менску, праводзіцца пасьля сканчэньня перарэгістрацыі па горадзе, з 1 красавіка 1931 г. па 10 красавіка 1931 г.

4. Абавязаць усіх грамадзян, дамакіраўніцтвы і дамаўласьнікаў даваць рэгістратарам адказы на ўсе пытаньні па перарэгістрацыі, а таксама прадстаўляць ім усе патрэбныя дакуманты для правядзеньня перарэгістрацыі.

5. Для правядзеньня перарэгістрацыі, у ЖАКТ-ах, камунальных дамох, дзіцячых дамох інтэрнацкага тыпу, папраўча-працоўных дамох і г. д. домакіраўніцтвы і адміністрацыя гэтых устаноў павінны вылучыць асобных працаўнікоў для правядзеньня рэгістрацыі пад кіраўніцтвам вучастковых Бюро, якія будуць утвораны пры аддзяленьнях міліцыі.

6. Усім дзяржаўным установам і службовым асобам прапануецца аказваць усялякую дапамогу працаўнікам па правядзеньні перарэгістрацыі.

7. Інспэктарам Асьветы і Працы працягнуць да ўдзелу ў правядзеньні перарэгістрацыі, працаўнікоў устаноў, студэнтаў і вучняў з аслабаненьнем іх на час працы па перарэгістрацыі ад выкананьня іх непасрэдных абавязкаў.

8. Для таго, каб пацьвердзіць права на атрыманьне наборнай кніжкі, а таксама для выяўленьня сумы сярэдняга заробку, ці прыбытку, неабходна ўсім грамадзянам падрыхтаваць да пачатку перарэгістрацыі адзін з нижэйпералічаных дакумантаў:

а) Разьліковую кніжку.
б) Даведку аб месцы працы і сумы заробку.
в) Прафсаюзны білет (з паказаньнем сумы заробку, за апошнія 3 месяцы).
г) Для вучняў стыпэндыятаў даведку навучальнай установы.
д) Кніжку сацстраху (для пэнсыянэраў).
е) Альбо іншы дакумант, які адзначае сродкі існаваньня.
ж) Наборныя карткі.

9. За няправільную дачу зьвестак пры перарэгістрацыі вінаватыя прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці паводле 250 арт. крымінальнага кодэксу.

Нам. Старшыні Менгарсавету Карановускі.
Сакратар Шалкавец.

Аб парадку прадстаўленьня заявак на рызьзё і паклю на 1931 год

БЕЛДЗЯРЖСНАБ І БЕЛУТЫЛЬ

ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ, што ўсе спажыўцы рызьзя абцірачнага і пакля-будаўнічага павінны прадставіць НЕ ПАЗЬНЕЙ **5 КРАСАВІКА г.г.** свае дакладныя заяўкі БЕЛДЗЯРЖСНАБУ—г. Менск.

У заяўках павінна быць паказана: адрас атрымальніка, станцыя прызначэньня, № кантакарэнтнага рахунку і платнік, тэрміны адг